ДЗЕСЯЦЬ МЯСЦІН ІВАНА МЕЛЕЖА

8–9

ЗАКАДЗІРАВАНАЯ ЭСТЭТЫКА

12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЛЮТАГА 2021 г. СУБОТА № 23 (29392)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ЛАБОВІЧ, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Складаны эпідэмічны перыяд таксама паказаў, што дыстанцыйныя формы занятасці могуць быць эфектыўныя для вытворчых працэсаў, зручныя для працадаўцаў і наймальнікаў, таму плануем уносіць прапановы па змяненнях у Працоўны кодэкс, дзе таксама аддадзім увагу развіццю гнуткіх формаў занятасці ў краіне».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«СЁННЯ КРАІНЕ ЯК ПАВЕТРА ПАТРЭБНЫЯ НОВЫЯ ПРАРЫЎНЫЯ, ЭФЕКТЫЎНЫЯ, ІНАВАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ»

Фота БелТА.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў дыпломы доктара навук і атэстаты прафесара

Гэта традыцыйная цырымонія — своеасаблівае падвядзенне вынікаў мінулага навуковага года. Беларускі лідар назваў яе ўдзельнікаў «атрадам разумных, таленавітых і працавітых прадстаўнікоў навукова-педагагічнай супольнасці».

Фактар незалежнасці

Ён павіншаваў прысутных з чарговым значным этапам у кар'еры і новым статусам, які адкрывае дадатковыя магчымасці.

«Сёння краіне як паветра патрэбныя новыя прарыўныя, эфектыўныя, інавацыйныя тэхналогіі, — сказаў Прэзідэнт. — ***Гэта выдатны шанц па-сапраўднаму заявіць аб сабе для тых, хто насамрэч закладзены развіццём навукі і лёсам нашай Беларусі».***

СТАР. 2

КАРАТКА

- **ДАІ заклікае кіроўцаў адмовіцца ад далёкіх паездак у моцны мароз.**
- Мінскі аўтамабільны завод прадставіў першы аўтобус МАЗ-203, укамплектаваны салонным ультрафіялетавым ачышчальнікам паветра.

- **У Брэсце да 14 лютага ўладкуюць фотазону і пляцоўкі для продажу кветак.**
- КДК папярэджвае грамадзян аб росце колькасці выпадкаў тэлефоннага махлярства.
- **Плацельшчыкамі транспартнага падатку будзе больш за два мільёны беларусаў.**
- У Пекіне прадставілі дызайн алімпійскага факела зімовых Гульняў.

- **Беларусы ў студзені купілі валюты на $154 млн больш, чым прадалі.**

ISSN 1990 — 763X

У цэнтры ўвагі

ІНФРАСТРУКТУРА, КАМАНДА, ПАДТРЫМКА

У беларускіх ВНУ плануюць ствараць і мадэрнізаваць навучальныя лабараторыі і STEM-цэнтры

Па ініцыятыве Міністэрства адукацыі ва ўзаемадзеянні са спецыялістамі Сусветнага банка распрацаваны інвестыцыйны праект мадэрнізацыі вышэйшай адукацыі ў Беларусі. У ім задзейнічаны 18 вышэйшых навучальных устаноў. Пра гэта расказала першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА. У ліку найбольш значных мерапрыемстваў — стварэнне і мадэрнізацыя больш як 120 навучальных лабараторый, STEM-цэнтраў, цэнтраў сумеснага карыстання абсталяваннем з мэтай падтрымкі практычных аспектаў навучання студэнтаў.
Па словах Ірыны Старавойтавай, беларускія ўніверсітэты працягваюць развіваць узаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі. Гэтаму спрыяе ў тым ліку спецыяльна створаны міністэрствам міжгаліновы задачнік, у адпаведнасці з якім ВНУ працавалі па больш чым 60 значных для прамысловых прадпрыемстваў тэхналагічных запытах у сферы машынабудавання, хімічнай прамысловасці, перапрацоўкі адходаў, металургіі...
У планах міністэрства — праектаванне адукацыйных стандартаў пакалення 3+ з улікам патрэбы працадаўцаў у выпускніках з унікальнымі і ўніверсальнымі прафесійнымі кампетэнцыямі, а таксама з'яўленне новых спецыяльнасцяў, арыентаваных на падрыхтоўку спецыялістаў для V і VI тэхналагічных укладаў.

СТАР. 5

Удзельнікі першай адукацыйнай змены Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка праходзяць у БДУ падрыхтоўку па кірунку «зялёная хімія» на хімічным факультэце ўніверсітэта.

Будзьце пільныя!

МАЁМАСЦЬ У СВАБОДНЫМ ДОСТУПЕ

Як абараніць сваё дабро

Напэўна, многія бывалі ў сітуацыі, калі з кішэні ці сумкі выцягнулі кашалёк у транспарце, на рынку, іншым шматлюдным месцы. У такім выпадку вы пацярпелі ў выніку вераломных дзеянняў зламыснікаў. Сваю злачынную тэхніку яны адпрацоўваюць гадамі, такім прафесійным прыёмам не вельмі проста супрацьстаяць. Альбо калі злодзей пранікае ў кватэру, папярэдне высачыўшы адсутнасць гаспадароў... Але ці ведаеце вы, што каля 60 працэнтаў крадзяжоў ажыццяўляецца шляхам свабоднага доступу? Як той казаў, бяры — не хачу.

Пра даму з сабачкам і даму з калье

Прынамсі, так было на працягу мінулага года на Брэстчыне. Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, за год у рэгіёне зарэгістравана крыху больш за 2300 крадзяжоў. Больш за палову з іх здзейснена з-за неабачлівасці грамадзян, альбо як кажуць у міліцыі, шляхам свабоднага доступу. Схема найбольш простая і найбольш распаўсюджаная: зайшоў у госці да новага знаёмага, выпіў, а калі гаспадар крыху асалавеў ці канчаткова страціў пільнасць, прыхапіў нешта каштоўнае «на памяць».

СТАР. 7

«СЁННЯ КРАІНЕ ЯК ПАВЕТРА ПАТРЭБНЫЯ НОВЫЯ ПРАРЫЎНЫЯ, ЭФЕКТЫЎНЫЯ, ІНАВАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Навука, па словах беларускага лідара, даўно стала не толькі інструментам пазнання, але і рэальнай прадукцыйнай сілай, якая вызначае прагрэс ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці. «Больш за тое, ***яна — найважнейшы фактар умацавання незалежнасці і суверэнітэту дзяржавы,*** — дадаў ён. — ***Узровень развіцця навукі прадвызначае ролю і месца краіны на палітычнай карце свету, магчымасці эканомікі і абароназдольнасць».***

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што мы жывём у свеце, дзе хутка змяняюцца трэнды, веды і тэхналогіі, і сёння як ніколі ўзрастае значнасць стратэгічных прагнозаў і дакладнасці экспертных ацэнак.

«Мы ставім вялікія мэты на пяцігодку: значна павялічыць навукаёмістасць ВУП, выйсці на ўзровень інавацыйнага развіцця краін-лідараў Усходняй Еўропы. Маем намер прыкметна рушыць наперад па такіх кірунках, як інавацыйная ахова здароўя, біятэхналогіі, нацыянальны электратранспарт, «разумныя гарады», — сказаў ён. — Аднак без вас — людзей навукі, без вашага актыўнага ўдзелу ў гэтых праектах наўрад ці магчыма іх рэалізаваць».

Асаблівасць сёлетняй цырымоніі — прысутнасць на ёй навукоўцаў, якія зрабілі значны ўнёсак у поспех сваіх калег.

«У гэты прагматычны век дарагога вартая праца настаўніка, накіраванага на стварэнне навуковай школы і падрыхтоўку маладых навукоўцаў. Гэта па-нашаму, па-дзяржаўнаму», — сказаў Прэзідэнт і звярнуў увагу на найважнейшую ролю настаўнікаў для выпускнікоў ВНУ.

Ён толькі часткова пагадзіўся з думкай, што ў Нацыянальнай акадэміі навук мала моладзі, бо вучоныя старэйшага пакалення — «крыніца ведаў» і «сама навука». ***«Вельмі задаволены, што старэйшае пакаленне наша вучыць моладзь, і, як мінулы год паказаў, гэта вельмі важна — важна старэйшае пакаленне. Ідзе змена пакаленняў — каб мы нашай моладзі перадалі той вопыт, тыя веды, якія мы назапасілі за доўгі час работы»,*** — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што зайздросціць вучоным, бо мала таго, што іх праца выключна

Фота БелТА.

Навукоўцам у Палацы Незалежнасці зладзілі экскурсію.

цяжкая, — «у навуцы трэба быць адораным і таленавітым чалавекам». Ён нагадаў, што ў свой час умацаваў і падпарадкаваў ВАК, каб не дапусціць дэвальвацыі дзейнасці вучоных.

Шчырая гутарка

Пасля ўручэння дыпломаў дзевяці дактарам навук і чатырох атэстатаў прафесарам Прэзідэнт заўважыў, што такая цырымонія, як даніна павагі кіраўніка дзяржавы навукоўцам, — новая традыцыя незалежнай Беларусі.

«Дактароў, прафесараў значна больш, чым прысутнічае сёння за гэтым сталом, і атрымала ў гэты момант званні, вучоныя ступені значна больш. Але я заўсёды казаў, што мая задача як першага Прэзідэнта незалежнай Беларусі, — умацаваць тыя традыцыі, якія былі, і сфармуляваць і стварыць новыя традыцыі», — сказаў ён і запрасіў удзельнікаў урачыстасці расказаць пра свае дасягненні і пра тое, якую тыя маюць карысць для сённяшняга дня.

Доктар медыцынскіх навук, дацэнт, прафесар кафедры інфекцыйных хвароб БДМУ Дзмітрый Данілаў атрымаў навуковую ступень за ўстанаўленне генетычных фактараў, якія вызначаюць эфектыўнасць лячэння хранічных вірусных гепатытаў В і С, і доказ высокай эфектыўнасці лекавых сродкаў прамога супрацьвіруснага дзеяння, якія выкарыстоўваюцца ў Беларусі для лячэння пацыентаў з вірусным гепатытам С. Гэта паўплывала не толькі на тое, што Беларусь апынулася ў ліку краін з найлепшымі поспехамі па доступе насельніцтва да лячэння віруснага гепатыту С, а нашы дасягненні ў гэтай сферы набылі сусветнае прызнанне, але і на тое, што адмоў у трансплантацыі печані ў нашай краіне стала менш. Гэта значыць, у выніку захавана больш чалавечых жыццяў.

Начальнік цэнтра развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка, дацэнт Аляксандра Пазняк атрымала доктарскую ступень за стварэнне і ўкараненне мадэлі педагагічных класаў у школах, дзякуючы чаму ў апошнія пяць гадоў удалося выправіць негатыўную сітуацыю з наборам у педагагічныя ВНУ краіны. У выніку менш выпадковых людзей атрымлівае прафесію настаўніка, выпускнікі педкласаў лепш вучацца ў ВНУ, часцей становяцца лідарамі і актывістамі, больш асэнсавана выбіраюць спецыяльнасць. Гэты вопыт аказаўся запатрабаваны і ў іншых сферах: ствараюцца аграрныя, спартыўна-педагагічныя класы. Падобным чынам можна выхоўваць абітурыентаў для ваенных і інжынерных ВНУ.

Расказ вучонай стаў нагодай для разваг кіраўніка дзяржавы аб ролі настаўніка ў выхаванні моладзі. «Усе мы па сваім жыцці настаўнікі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта — вялікае званне. Знікне настаўнік — не будзе вучоных, спецыялістаў, інжынераў, нават урачоў».

Моладзі — увага асаблівая

Ён падзяліў заклапочанасць суразмоўцы прыніжэннем статусу настаўніка і сказаў пра іншую небяспеку, якая вынікае з гэтага. «Падзеі канца мінулага года, паслявыбарныя гэтыя падзеі паказалі, што нам больш сур'ёзна трэба ставіцца да навучання нашай моладзі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Інакш мы атрымаем вялікія праблемы ў перспектыве, вельмі вялікія».

Калі сітуацыю не ўдасца пераламіць, можа атрымацца вайна, упэўнены лідар. «І баюся, што ва ўмовах геапалітычнага разлому (пра гэта мы будзем казаць, напэўна, на сходзе яшчэ) мы не зможам утрымацца ў рамках унутранага раздраю, нейкай грамадзянскай вайны, — дадаў ён. — Абавязкова ўмяшаюцца іншыя гульцы. Я часта намякаю: глядзіце, каб наша Беларусь не стала полем бітвы, полем вайны, дзе будуць вырашацца не нашы пытанні».

Менавіта такім чынам развіваюцца канфлікты ў іншых пунктах свету, нагадаў беларускі лідар. «Таму ***нам трэба сваімі рукамі не прывесці краіну ў гэты хаос. І тут многае будзе залежаць ад выкладчыкаў»,*** — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што дзяржава будзе ўзнімаць ролю мэтавых накіраванняў студэнтаў. «Абавязкова будзем гэта рабіць. Нам вельмі важна, каб не толькі ў Мінску канцэнтраваліся (маладыя спецыялісты. — **«Зв.»**): скончылі ВНУ і тут недзе любым чынам замацаваліся. ***Нам трэба раўнамерна размяркоўваць па краіне прадукцыйныя сілы»,*** — дадаў Аляксандр Лукашэнка. ***«Таму мэтавыя накіраванні будуць набываць вельмі сур'ёзнае значэнне»,*** — падкрэсліў ён.

Профільныя класы педагагічнай накіраванасці Аляксандр Лукашэнка назваў удалым прыкладам прафарыентацыі школьнікаў. «На гэта варта выдаткоўваць грошы, таму што калі чалавек прыйдзе ў ВНУ і праз некаторы час зразумее, што ён не туды трапіў, а мы на яго выдаткавалі велізарныя грошы, і нам давядзецца потым яго перавучваць, гэта будзе даражэй каштаваць», — перакананы беларускі лідар. Таксама ён падкрэсліў важнасць практыкаарыентаванага навучання ў ВНУ. Студэнтаў да работы па іх будучай прафесіі трэба прыцягваць ужо з другога курса, лічыць Прэзідэнт.

***

У час размовы навукоўцаў з Прэзідэнтам зайшла гаворка пра сучасныя распрацоўкі ў галіне сельскай гаспадаркі і аховы раслін, якія непасрэдна ўплываюць на пытанні харчовай бяспекі, павышэнне эфектыўнасці ў АПК.

Прэзідэнт падзякаваў вучоным за карысную, цікавую гутарку.

«Паверце, для мяне гэта не проста вопыт, гэта веды. Я вучуся ў вас, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я вельмі цаню хвіліны, гадзіны зносін з вамі, вельмі ўдзячны вам за гэта. Ведайце: наколькі толькі магчыма, мы будзем падтрымліваць вучоных. Не таму што я такі дабрадзей, а таму што без навукі ў сучасным свеце мы нікуды не прасунемся».

❍ Даведка «Звязды»

У 2020 годзе Вышэйшая атэстацыйная камісія Рэспублікі Беларусь прысудзіла вучоную ступень 347 суіскальнікам, з іх 40 атрымалі ступень доктара навук, 307 — кандыдата навук.

Сярэдні ўзрост суіскальнікаў вучонай ступені кандыдата навук — 35,5 года, доктара навук — 49,8 года.

Найбольшая колькасць вучоных ступеняў прысуджана ў медыцынскіх (19 %), тэхнічных (19 %), эканамічных (11 %), фізіка-матэматычных (10 %), філалагічных (7 %), педагагічных (6 %), біялагічных (5 %), гістарычных (5 %), сельскагаспадарчых (5 %) і юрыдычных (4 %) навуках.

Вучонае званне прафесара ў 2020 годзе прысвоена 31 суіскальніку, дацэнта — 313.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на працягу апошніх гадоў у Беларусі шмат зроблена па развіцці розных кірункаў, і немалая роля ў гэтым належыць навукоўцам, напрыклад, у медыцыне або сельскай гаспадарцы. У многіх пытаннях кіраўнік дзяржавы ўдзельнічаў асабіста — прымаліся рашэнні, даваліся неабходныя даручэнні.

«Мы гэта ўсё прайшлі. Гэта няпросты быў шлях і перыяд», — канстатаваў ён.

Звяртаючыся да навукоўцаў як да прадстаўнікоў айчыннай эліты, Прэзідэнт параіў узважана ацэньваць падзеі, што адбываюцца, і не рабіць паспешных высноў. «Вы — людзі адукаванья, вы фарміруеце меркаванні людзей, вы — твар дзяржавы, вы і павінны абараняць гэту дзяржаву», падкрэсліў ён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пандэмія прывяла да росту тэрарыстычных пагроз

Пандэмія каранавіруса прывяла да росту пагроз з боку такіх тэрарыстычных груповак як «Ісламская дзяржава» і «Аль-Каіда» ў Афганістане, Іраку і Сірыі. Аб гэтым паведаміла агенцтва Associated Press са спасылкай на даклад экспертаў ААН. На думку экспертаў, экстрэмісты ўмацоўваюць свае пазіцыі на афрыканскім кантыненце — у Заходняй Афрыцы, Мазамбіку, дзе ад іх дзеянняў найбольш пакутуе правінцыя Кабу-Делгаду на поўначы краіны. Спецыялісты заключылі, што «пандэмія перашкодзіла актыўнасці сіл правапарадку больш, чым тэрарыстаў». Пры гэтым пры аслабленні эпідэмічных абмежаванняў у шэрагу рэгіёнаў свету можна чакаць здзяйснення раней запланаваных тэрарыстычных нападаў.

У Германіі пачаліся моцныя паводкі

Рэкі ў шэрагу рэгіёнаў Германіі выйшлі з берагоў з-за расталага снегу і працяглых дажджоў, што прывяло да паводак, паведаміла агенцтва Associated Press. У прыватнасці, падняўся ўзровень вады ў Рэйне на поўнач ад Кёльна. На поўдні Германіі паводкі абрынуліся на землі Рэйнланд-Пфальц і Гесэн. Раней на гэтым тыдні было прыпынена рачное суднаходства на Рэйне, паколькі рух пад мастамі стаў небяспечны з-за высокага ўзроўню вады. Нямецкія метэаралагічныя службы папярэджваюць, што да выхадных сітуацыя можа пагоршыцца, — узровень вады ў рэках падымецца яшчэ вышэй.

У Іспаніі запускаюць пілотны праект чатырохдзённага рабочага тыдня

Спецыялісты Міністэрства прамысловасці, гандлю і турызму Іспаніі і прадстаўнікі левацэнтрысцкай партыі Mas Pais пачалі прапрацоўку дэталяў пілотнага праекта па пераводзе прадпрыемстваў на чатырохдзённы, альбо 32-гадзінны рабочы тыдзень, з захаваннем зарплаты супрацоўнікаў. Аб гэтым паведаміла газета El Confidencial. Рабочыя кансультацыі пачаліся пасля таго, як урад Іспаніі ўхваліў пілотны праект, які даказвае перавагі «чатырохдзённі». У рамках выпрабавання ўрад выдзеліць 50 мільёнаў еўра для дапамогі кампаніям, якія добраахвотна пагодзяцца перавесці персанал на 32-гадзінны працоўны тыдзень без скарачэння заработнай платы. Гэтыя сродкі мяркуецца атрымаць з сумы ў €140 млрд, якія прыпадаюць на долю Іспаніі ў еўрапейскіх фондах для барацьбы з COVID-19, паведаміла газета Cuatropoder.

У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГАВАЙ ПЛЯЦОЎКІ

Маладзёжная палітыка ў дзеянні

У Савеце Рэспублікі працягваецца серыя сустрэч спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ з прадстаўнікамі моладзі розных навучальных устаноў краіны. Днямі Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу прымала маладых гасцей з Полацка.

Фота БелТА.

— Такія сустрэчы даюць магчымасць парламентарыям, у дадзеным выпадку сенатарам, непасрэдна паразмаўляць напрамую з маладымі, з першых вуснаў даведацца аб тым, што іх хвалюе, пачуць іх прапановы і ідэі, — упэўнена Наталля Качанава.

І вось чарговая група моладзі — дэлегацыя навучэнцаў Полацкага каледжа ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» завітала ў Савет Рэспублікі. Ініцыятарам іх запрашэння выступіла пярвічная арганізацыя «Беларускага саюза жанчын» апарата супрацоўнікаў верхняй палаты парламента. Прадстаўнікі гэтай «пярвічкі» зладзілі для гасцей з Полацка экскурсію па будынку Савета Рэспублікі.

Пасля адбылася размова са старшынёй Савета Рэспублікі. Наталля Качанава адразу прапанавала форму дыялогавай пляцоўкі. Маладыя людзі пыталіся і атрымлівалі разгорнутыя адказы і каментарыі, напрыклад, пра стаўленне да асобных крыніц інфармацыі ў інтэрнэце, пра работу Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе. Пытанні да Наталлі Качанавай былі на самыя розныя тэмы, у тым ліку і нечаканыя. Скажам, пра яе працоўны шлях, прыступкі кар'ернай лесвіцы, адносіны да каманднага стылю работы, наяўнасць хобі.

У сваю чаргу Наталля Качанава распытвала суразмоўцаў пра вучобу, пра тое, чым яны займаюцца ў вольны час, ці ёсць умовы для заняткаў спортам, мастацтвамі, танцамі і г. д. У адказах гасцей адчувалася, што юнакі і дзяўчаты па праве ганарацца слаўнай гісторыяй свайго знакамітага каледжа — адной з найстарэйшых у Беларусі навучальных устаноў. Сёння ў ёй, як і амаль 150 гадоў назад у тагачаснай Полацкай настаўніцкай семінарыі, рыхтуюць спецыялістаў для сістэмы адукацыі краіны. (Тады, праўда, для так званых народных школ.) Цяпер Полацкі каледж — гэта сучасная мабільная навучальная ўстанова, у якой традыцыі плюс прафесійны калектыў выкладчыкаў дазваляюць выпускаць спецыялістаў і для іншых сфер дзейнасці нашай краіны.

Госці з Полацка шчыра падзякавалі Наталлі Качанавай за такую цікавую сустрэчу, за магчымасць шчыра пагаварыць.

Дырэктар Полацкага каледжа, член Савета Рэспублікі Таццяна Палушкіна расказала журналістам, што яе выхаванцы з вялікай цікавасцю ўспрынялі навіну аб маючай адбыцца паездцы ў Мінск. Ахвотных было шмат, паміж імі нават разгарнулася негалоснае спаборніцтва. Зразумела, паехалі найлепшыя. Сярод іх лаўрэаты конкурсаў, у тым ліку і пераможца конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Таксама ў групу ўключылі сірот з ліку навучэнцаў установы.

Пасля завяршэння сустрэчы Наталля Качанава пажадала навучэнцам каледжа горача любіць родную Беларусь, добра вучыцца, і самае галоўнае — заўсёды думаць аб нашай рэчаіснасці, аналізаваць і супастаўляць факты з розных крыніц.

Леанід ТУГАРЫН.

Камунальныя стасункі

ЗА ЯКАСЦЬ І СУПРАЦЬ ШКОДЫ

Няпрофільныя аб'екты — пагроза для ЖКГ, а трэцяя частка даўжнікоў па аплаце жыллёва-камунальных паслуг — насельніцтва. Гэтыя і іншыя праблемныя моманты, а таксама дасягненні дзяржапраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» і планы на будучыню гаспадаркі абазначыў на выніковай калегіі жыллёва-камунальнай гаспадаркі міністр ведамства Андрэй ХМЕЛЬ.

Намінальныя тэрміны і аптымізацыя расходаў

— Па выніках 2020-га нам удалося забяспечыць неабходныя аб'ёмы і якасць ЖКП, а таксама ў асноўным выканаць паказчыкі эфектыўнасці работы, — падкрэсліў міністр ЖКГ Андрэй Хмель. — *Працягваецца работа па аптымізацыі расходаў на аказанне камунальных паслуг. Такі падыход дазволіў не дапусціць рэзкага павышэння тарыфаў для насельніцтва і забяспечыць рост у межах устаноўленага калідора.*

Станоўчым момантам работы гаспадаркі за 2020 год міністр назваў рэалізацыю дзяржапраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», абсалютным лідарам у выкананні паказчыкаў якой стала Магілёўская вобласць.

Летась у краіне адрамантавалі больш за 3 млн м² жылля, але нават такая значная лічба не дазволіла дасягнуць запланаванага ўзроўню ў 3 % ад агульнага аб'ёму жылля, у сувязі з чым міністр заклікаў не зацягваць нарматыўныя тэрміны выканання работ і звярнуў увагу, што гэта павінна стаць адной з задач на 2021-ы. «Комплексны рамонт з найбольш поўным складам работ у асноўным выконваецца толькі ў Мінску і часткова ў Гомельскай вобласці», расказаў ён.

Навошта камунальнікам метэастанцыя і казарма

Нягледзячы на станоўчыя вынікі выканання дзяржпраграмы, колькасць стратных прадпрыемстваў ЖКГ павялічылася на чатыры арганізацыі (у Мінскай вобласці і сталіцы). Прычыну міністр бачыць у эпідэмічнай сітуацыі, бо страты нясуць асабліва тыя арганізацыі, якія маюць інтэрнаты і лазні. Таму задача міністэрства — прыняць неабходныя меры для павышэння эфектыўнасці работы галіны.

Няпрофільныя аб'екты застаюцца пагрозай для ЖКГ. Хоць Дырэктывай № 7 дакладна вызначана, што неабходна не дапускаць перадачы арганізацыям ЖКГ няпрофільных аб'ектаў без фінансавага забеспячэння, іх колькасць (без фінансавання) расце, паведаміў міністр:

— Страты ад утрымання такіх аб'ектаў у 375 тысяч рублёў — лічба, здаецца, невялікая, аднак гэта страты, якія паказалі арганізацыі, а колькі засталося нябачных. На баланс ЖКГ практычна ва ўсіх абласцях перададзены склады, кароўнікі, цялятнікі, будынкі турбаз, летнікаў, сховішчы для гародніны. Мядзельскай ЖКГ, напрыклад, не вернуты затраты на ўтрыманне летняга тэатра, рынку, складскога памяшкання, у Любанскай ЖКГ — на ўтрыманне метэастанцыі (па заданні ваенкамата), у Асіповіцкім раёне — піларамы, амбулаторыі, склада, казармы.

Хто вінен мільёны...

Сума пратэрміновай за 2020 год дэбіторскай запазычанасці за ЖКП склала 106,6 млн рублёў і вырасла на 5,5 млн у параўнанні з папярэднім годам. Несвоечасова разлічваюцца за ЖКП і сельгасарганізацыі (31,1 млн). Сем мільёнаў вінныя ЖКГ будаўнічыя і прамысловыя арганізацыі краіны, 2,4 млн — бюджэтныя.

Аднак больш за ўсіх вінныя міністэрству жыхары — каля трэці агульнай сумы запазычанасці — 34,9 млн, прычым траціна з даўжнікоў — мінчане. Пратэрмінаваных асабовых рахункаў летась было 44 тысячы — цяпер амаль удвая больш (95 тысяч).

— Напрошваецца адна выснова, што работу з даўжнікамі мы неапраўдана аслабілі, і трэба, пэўна, прымаць меры з больш жорсткімі падыходамі, давайце гэта прапаноўваць ураду, — выказаўся наконт праблемы міністр. *— Гэтую тэндэнцыю трэба спыняць.*

Ірына СІДАРОК.

Ва ўрадзе

АБАРАНЯЦЦА ЯК САЮЗ

«Наша інтэграцыя дастаткова прасунулася, каб распачаць рэалізацыю ўзгодненай прамысловай і аграпрамысловай палітыкі». Аб гэтым прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА заявіў на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета, які праходзіў 4-5 лютага ў Алматы.

Як паведаміла прэс-служба ўрада, выступаючы на пасяджэнні, Раман Галоўчанка асаблівую ўвагу аддаў імпартазамяшчэнню, у першую чаргу стратэгічнай прадукцыі і тэхналогій. «Карыстаючыся любымі падставамі, так званы калектыўны Захад імкнецца прытармазіць наша эканамічнае развіццё, уводзяцца санкцыі, блакіруюцца фінансаванне і рэалізацыя важных інфраструктурных праектаў, забараняецца перадача тэхналогій, спыняюцца пастаўкі неабходных для вытворчасцяў перадавой прадукцыі і камплектуючых. Аналагічная сітуацыя і з доступам на знешнія рынкі. Свет імкліва мяняецца, пратэкцыянізм узмацняецца, і асабліва гэта характэрна для нашых заходніх партнёраў, — адзначыў ён. — З улікам цяперашніх рэалій нам неабходна не толькі імкнуцца да заключэння новых гандлёвых пагадненняў, але і ўмець абараняць свае правы ва ўзаемаадносінах з трэцімі краінамі, абараняць менавіта як блок, як саюз».

Важнае значэнне ў гэтым кантэксце мае пытанне аб механізме прымянення на ўзроўні ЕАЭС мер у адказ.

Выказаўся беларускі прэм'ер і пра важнасць асвойвання новых рынкаў. Па яго словах, можна будзе напоўніць новым зместам асноўныя кірункі прамысловага супрацоўніцтва ў рамках ЕАЭС.

«Наша інтэграцыя дастаткова прасунулася, каб распачаць рэалізацыю ўзгодненай прамысловай і аграпрамысловай палітыкі. Магчыма, у будучыні яна стане і павінна стаць не проста ўзгодненай, але і адзінай. Неабходна забяспечваць парытэт інтарэсаў пры арганізацыі і развіцці прамысловых вытворчасцяў у краінах — членах ЕАЭС і фарміраваць такім чынам дадатковы экспартны патэнцыял», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

Марыя ДАЛАЛКА.

Транспарт

Паэтапнае аднаўленне пачынаецца

Літаральна з 8 лютага пачынаецца паэтапнае аднаўленне міжнародных пасажырскіх зносін паміж нашай краінай і Расіяй, паведаміў учора міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА перад выніковай калегіяй ведамства.

На першапачатковым этапе будзе арганізавана курсіраванне фірменнага хуткага цягніка «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква, сфарміраванага Беларускай чыгункай. Гэты цягнік адпраўляецца з Мінска па цотных, а з Масквы — па няцотных днях.

Таксама з 9 лютага хуткаму фірменнаму цягніку «Янтар» № 30/29 Калінінград — Масква, фарміраванне Расійскай чыгункі, прадпісаны прыпынак на станцыі Мінск-Пасажырскі для пасадкі/высадкі пасажыраў.

Ажыццяўленне праезду названымі цягнікамі ў зносінах Мінск — Масква — Мінск прадугледжана толькі для грамадзян нашай краіны і Расіі.

Таксама міністр адзначыў, што вырасце колькасць авіярэйсаў паміж Масквой і Мінскам з трох да пяці ў тыдзень, адновяцца і маршруты паміж Мінскам і Пецярбургам, Мінскам і Растовам-на-Доне па адным у тыдзень.

Адказваючы на пытанне журналіста нашага выдання, Аляксей Аўраменка паведаміў, што страты транспартнай галіны з-за пандэміі склалі каля 350 млн рублёў.

Па словах міністра, у асноўным пацярпеў пасажырскі сектар. У прыватнасці, страты панеслі авіякампанія «Белавія», Нацыянальны аэрапорт Мінск, аўтамабільны транспарт, які ажыццяўляў міжнародныя перавозкі пасажыраў, і іншыя.

«Абмежаванні закранулі не толькі пасажырскія перавозкі, але і грузавыя. Былі ўведзены дадатковыя патрабаванні да міжнародных перавозчыкаў, каранцінныя мерапрыемствы — усё гэта, адпаведна, памяншала грузаабарот», — растлумачыў ён. Міністр адзначыў, што гэта беспрэцэдэнтная сітуацыя для транспартнай галіны, якіх не было за ўсю найноўшую гісторыю, калі спыняюцца чыгуначныя, авіяцыйныя зносіны. «Мы павінны і можам паступова ліквідаваць гэтыя дыспрапорцыі», — адзначыў Аляксей Аўраменка.

Сяргей КУРКАЧ.

«ЦАНІЦЕ І ШАНУЙЦЕ ТОЕ, ШТО МАЕЦЕ»

Галіна ВАРАЖБІТ, кіраўніца беларускай суполкі «Сябры» з украінскага Чарнігава, — у ліку тых, хто запрошаны на VI Усебеларускі народны сход ад прадстаўнікоў беларускай дыяспары.

Магчыма, людзі на Мядзельшчыне пакуль што і не ведаюць, што іх зямлячка з Чарнігава ў ліку іншых збіраецца ў Мінск на прадстаўнічы форум. Прыадкрываем некаторыя факты, з якіх і сама Галіна Міхайлаўна не робіць таямніцы: у дзявоцтве яна мела прозвішча Шаховіч, родам — з мястэчка Крывічы Мядзельскага раёна Міншчыны.

«Хочацца ўсім беларусам пажадаць: думайце і «падключайце» сэрца, калі прымаеце адказныя, лёсавызначальныя рашэнні. Мой жыццёвы досвед падказвае, што ніколі не варта ісці за тымі, хто проста шмат абяцае, ды рэальна для Бацькаўшчыны анічога не зрабіў. Мне вельмі хочацца, каб землякі мае не надзявалі ружовыя акуляры — каб бачылі, хто ёсць хто».

Цяпер яе «родны кут» — цэнтр сельсавета, у якім звыш тысячы жыхароў. Мястэчку больш за 520 гадоў, знаходзіцца яно за тры кіламетры ад чыгуначнай станцыі Крывічы, што на лініі Маладзечна — Полацк. Некалі гэта была тэрыторыя Ашмянскага павета Віленскага ваяводства ў Вялікім Княстве Літоўскім. З даўніх часоў паселішча ўпрыгожвае касцёл, і, дарэчы, па лініі маці ў родзе Галіны ўсе былі каталікі, па бацькавай — праваслаўныя. Хрысцілі дзяўчынку ў праваслаўнай царкве, а значна пазней у той жа царкве — і мужа Галіны. Усе дзеці ў Крывічах, згадвае Галіна Міхайлаўна, у пару яе дзяцінства выхоўваліся ў глыбокай веры, з захаваннем усіх народных і хрысціянскіх традыцый.

Пасля школы Галіна Шаховіч скончыла з высокімі адзнакамі сельскагаспадарчы тэхнікум і атрымала спецыяльнасць тэхніка-пчаляра. Потым прадоўжыла навучанне ў Кіеўскай сельгасакадэміі. Там жа сустрэла будучага мужа-ўкраінца родам з Чарнігаўскага раёна. Пасля заканчэння вучобы ў 1983-м маладыя спецыялісты тры гады аддалі калгасу, затым пераехалі ў Чарнігаў.

Галіна Міхайлаўна 28 гадоў адпрацавала ў абласным упраўленні сельскай гаспадаркі, потым выйшла на пенсію. У сям'і нарадзіліся ды выраслі два сыны і дачка, ёсць і ўнукі. Унучка спадарыні Галіны, вучаніца 9-й чарнігаўскай школы Лізавета Варажбіт, ужо далучана да спраў беларускай суполкі. Ліза добра малюе, нават атрымала некалькі дыпломаў за паспяховы ўдзел ва Усеўкраінскім конкурсе дзіцячых малюнкаў па кнізе Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі». Той конкурс да юбілею класіка ладзіў Цэнтр беларускай мовы і літаратуры імя Уладзіміра Караткевіча (ён створаны і дзейнічае ў Інстытуце філалогіі Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі) з падтрымкай пасольства Беларусі ва Украіне.

Чарнігаўская суполка «Сябры» цяпер вядомая сярод беларусаў Украіны. Пра яе стварэнне Галіна Варажбіт згадвала наступнае: «У 2003 годзе ў нашу абласную дзяржадміністрацыю прыехаў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь Віталь Курашык. Тады ж губернатар мяне папрасіў распавесці госцю пра жыццё мясцовых беларусаў. Пра сваё жыццё я магла расказаць шмат, але колькі беларусаў жыве ў Чарнігаве і вобласці — нават не ведала. Тады пасол і прапанаваў мне стварыць у Чарнігаве ўкраінска-беларускую суполку». Так што з лёгкай рукі Віталя Курашыка і пачалася гісторыя беларускай суполкі ў Чарнігаве: яе зарэгістравалі 16 ліпеня 2003 года. І ўвесь час кіруе «Сябрамі» — а гэта больш за сто чалавек — Галіна Варажбіт.

Галіна Міхайлаўна выказала спадзяванне, што ўсё складзецца добра і яна паўдзельнічае ў народным вечы: «Я гэтым вельмі ганаруся, бо люблю Беларусь і зычу сваім землякам дабра і росквіту. Хочацца ўсім беларусам пажадаць: думайце і «падключайце» сэрца, калі прымаеце адказныя, лёсавызначальныя рашэнні. Мой жыццёвы досвед падказвае мне, што ніколі не варта ісці за тымі, хто проста шмат абяцае, ды рэальна для Бацькаўшчыны анічога не зрабіў. Мне вельмі хочацца, каб землякі мае не надзявалі ружовыя акуляры — каб бачылі, хто ёсць хто. Каб цанілі ды шанавалі ўсё тое, што ўжо зроблена ў Беларусі. А заслуга Прэзідэнта ў гэтым вялікая. І з боку, нават з нашага блізкага замежжа, тое вельмі добра відаць. Прычым, паверце: нам, беларусам Украіны, ёсць з чым параўноўваць. І мне вельмі хочацца, аж да слёз, каб родныя мае людзі, усе беларусы цанілі ды ўсімі сіламі зберагалі тое, што дасягнута, што сёння маюць. Каб потым не шкадаваць, нарабіўшы непапраўных памылак».

Іван ЖДАНОВІЧ.

«Сям'я — гэта база, на якой грунтуецца будынак пад назвай «дзяржава»

Дэпутат Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Вольга КРЭЧ (Гомельская-Навабеліцкая акруга № 36):

— Як вядома, адна з мэт развіцця Беларусі ў будучай пяцігодцы — павышэнне якасці жыцця насельніцтва. Для яе дасягнення вызначаныя такія прыярытэты, як шчаслівая сям'я, моцныя рэгіёны, інтэлектуальная краіна і дзяржава-партнёр. Мне як урачу, маці і жанчыне найбольш блізкі першы з іх — шчаслівая сям'я.

«Калі ў сям'і будзе ўзаемапавага, тады будзе павага і да іншых людзей: да настаўнікаў, дактароў, дворнікаў, прадаўцоў. У грамадстве не будзе хамства».

Сям'я — гэта база, фундамент, на якім грунтуецца будынак пад назвай «дзяржава». Ад трываласці першага залежыць устойлівасць другога.

У сям'і самае галоўнае — выхаванне дзяцей. Яно павінна быць заснавана на пашане да традыцый, прывучэнні да адказнасці за сябе і клопаце аб старэйшым пакаленні. Лічу, што гэта сёння асабліва важна.

Я амаль 30 гадоў працую педыятрам і бачу, што дарослыя залішне апякаюць дзяцей. Мы не даём ім самастойна прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць. Думаю, гэту пазіцыю трэба перагледзець. Неабходна адцягваць увагу ад тэлефонаў, тэлевізара, камп'ютара і больш размаўляць адзін з адным.

Калі ў сям'і будзе ўзаемапавага, тады будзе павага і да іншых людзей: да настаўнікаў, дактароў, дворнікаў, прадаўцоў. У грамадстве не будзе хамства. Думаю, з улікам падзей, якія адбываюцца ў нашай краіне, гэта актуальна.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Сярод «набалелых» пытанняў — транспартныя зносіны паміж вёскамі»

Загадчыца Баравікоўскага фельчарска-акушэрскага пункта Лунінецкага раёна, дэпутат Чучавіцкага сельскага Савета Людміла НАСЕНЯ.

Людміла Уладзіміраўна без малога 28 гадоў загадвае фельчарска-акушэрскім пунктам у вёсцы Баравікі на Лунінеччыне. У зоне яе ўвагі яшчэ дзве вёскі — Лугі і Кормуж. Да раённага цэнтра адсюль 40 кіламетраў. Па меддапамогу ў Лунінец з гэтых ледзве не самых аддаленых пунктаў раёна не наездзішся. Таму Людміла Уладзіміраўна для мясцовых жыхароў, а пераважная большасць з іх — людзі сталага веку, бадай, самы важны чалавек.

У 1993 годзе яна скончыла медвучылішча № 1 у сталіцы і вярнулася на малую радзіму. Ад фельчарска-акушэрскага пункта ў Баравіках, куды ўладкавалася малады спецыяліст, да яе роднай вёскі Чучавічы, дзе яна жыве і сёння, — дзевяць кіламетраў. Да вёсак Лугі і Кормуж таксама няблізка. Але дабірацца туды медык прызвычаілася ў любое надвор'е і ў любы час сутак:

— І на машыне, і на ровары, калі надвор'е дазваляе, і на папутках, і на вазах, і пешшу — за гэтыя гады якім толькі транспартам я не карысталася, — усміхаецца суразмоўніца.

Агулам у трох вёсках сёння жыве больш за 250 чалавек.

— За доўгі час работы я ведаю не толькі ўсіх жыхароў, але і іх дзяцей і ўнукаў. Добра памятаю, хто чым хварэе, якія лекі прымае.

«Забеспячэнне вялікіх вёсак рабочымі месцамі — таксама актуальнае пытанне. Моладзь з іх з'язджае, бо няма работы. Як шматдзетная матуля, я не магу заставацца абыякавай да будучыні нашай краіны, таму планую паўдзельнічаць у абмеркаванні самых розных пытанняў».

Да абеду Людміла Уладзіміраўна, як правіла, прымае пацыентаў у ФАПе. Змераць ціск, зрабіць укол, выпісаць рэцэпт, накіраваць да ўрача, калі патрабуецца больш сур'ёзнае абследаванне ці лячэнне, ды проста выслухаць пажылога чалавека — куды без гэтага? Пасля абеду — візіты да тых, хто не можа прыйсці самастойна.

— Пры неабходнасці звязваюся з урачом па тэлефоне ці праз «Вайбер», кансультуюся — сёння гэта вельмі дапамагае, — кажа суразмоўніца.

Перыядычна на ФАП прыязджаюць і акушэрка, і лабарант, каб узяць аналізы, і ўрач агульнай практыкі з участковай бальніцы, якая знаходзіцца ў Чучавічах. Ён аглядае пажылых пацыентаў і прызначае нескладаныя абследаванні, у прыватнасці, тую ж кардыяграму, якія робяцца на месцы. Калі патрэбна дапамога ўрача-спецыяліста — дае накіраванне ў раённую бальніцу.

На ФАПе можна набыць і неабходныя лекі:

— Акрамя пераліку прэпаратаў, якія ў нас пастаянна ў наяўнасці, прывозім тое, што заказваюць людзі. Хтосьці просіць больш дарагі прэпарат, некаму ўрач прапісвае лекі, якія нячаста патрабуюцца, таму іх няма ў нашым асартыменце, — расказвае Людміла Уладзіміраўна.

Сярод штодзённых клопатаў медыка і не зусім звычайныя. Чаму не былі пачышчаны і пасыпаны дарогі, чаму не прыехала аўтакрама. Апошнія гады Людміла Уладзіміраўна яшчэ і дэпутат Чучавіцкага сельскага Савета, і з гэтымі пытаннямі да яе звяртаюцца жыхары.

Акрамя таго, яна яшчэ і шматдзетная мама — выхавала чацвярых дзяцей. Старэйшай дачцэ — 27 гадоў, малодшаму сыну — 20. І ўжо мае дваіх унукаў.

Нягледзячы на тое, што яна выдатна ведае клопаты і праблемы і вясковых жыхароў, і сельскай медыцыны, прызнаецца: той факт, што яе абралі дэлегатам на VI Усебеларускі народны сход, стаў нечаканасцю:

— Адразу ўзнікла думка: чаму я? Я звычайная вясковая жанчына, якая робіць сваю работу, як і ўсе астатнія. Канешне, гэта прыемная, хоць і надзвычай адказная для мяне місія. Атрымала наказ ад аднавяскоўцаў — падзякаваць кіраўніцтву краіны за бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і пенсійнае забеспячэнне. Тое, як наладжана медыцынскае абслугоўванне ў нашых вёсках, у людзей не выклікае нараканняў. Сярод пытанняў, якія патрабуюць удасканалення, — транспартныя зносіны з аддаленымі населенымі пунктамі. Хацелася б, каб аўтобус хадзіў часцей. У прыватнасці, у нашу вёску ён прыязджае вельмі рана — у 5.50, назад вяртаецца ў 15 гадзін. Забеспячэнне вялікіх вёсак рабочымі месцамі — таксама актуальнае пытанне. Моладзь з іх з'язджае, бо няма работы. Як шматдзетная матуля, я не магу заставацца абыякавай да будучыні нашай краіны, таму планую паўдзельнічаць у абмеркаванні самых розных пытанняў.

Алена КРАВЕЦ.

ІНФРАСТРУКТУРА, КАМАНДА, ПАДТРЫМКА

Адметнасць універсітэцкіх тэхнапаркаў

Сёння ў ВНУ адточваюцца новыя падыходы па рабоце з адоранай моладдзю, схільнай да навуковай дзейнасці, ствараюцца ўмовы для таго, каб маладая асоба атрымала ўнікальныя кампетэнцыі, якія яна зможа выкарыстаць у дарослым жыцці.

— У прыватнасці, ВНУ ствараюць навуковыя падраздзяленні, што ў тым ліку займаюцца інавацыйнай дзейнасцю. У адным толькі Беларускім дзяржаўным універсітэце функцыянуе дзевяць навукова-даследчых цэнтраў і навукова-даследчых інстытутаў, — паведаміў падчас круглага стала ў БелТА **начальнік упраўлення навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі Алег БАРАНОЎСКІ.** — Створана разгалінаваная сетка інавацыйных падраздзяленняў па рэгіянальных ВНУ — гэта тэхнапаркі, цэнтры трансферу тэхналогій, галіновыя лабараторыі. Студэнты могуць рэалізоўваць магчымасці цэнтраў калектыўнага карыстання, у якіх размешчана ўнікальнае навуковае абсталяванне.

Адметнасць універсітэцкіх тэхнапаркаў у тым, што яны ўключаны ў навучальны працэс, кожны з іх мае сваю спецыялізацыю ў залежнасці ад таго, у якім рэгіёне ён знаходзіцца і якія навуковыя школы ў ім найбольш паспяховыя. У прыватнасці, тэхнапарк «Унітэхпрам БДУ» спецыялізуецца на вытворчасці ветэрынарных і фармакалагічных прэпаратаў, навукова-тэхнічны парк БНТУ «Палітэхнік» — на стварэнні і вытворчасці вырабаў медыцынскай тэхнікі. Дзейнасць тэхнапарка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта накіравана на стварэнне інавацыйнай вытворчасці ў лёгкай прамысловасці.

«Кожны малады навуковец хоча бачыць рэалізацыю сваіх навуковых ідэй і пачынанняў».

На 1 студзеня бягучага года ва ўніверсітэцкіх тэхнапарках краіны быў зарэгістраваны 61 рэзідэнт, і большасць з іх удзельнічае ў адукацыйным працэсе.

— Яшчэ адна адметнасць універсітэцкіх тэхнапаркаў — гэта стварэнне рэзідэнтаў супрацоўнікамі, выпускнікамі і студэнтамі ўніверсітэта, — падкрэсліў Алег Бараноўскі. — У прыватнасці, толькі ў ГрДУ імя Янкі Купалы заснавана шэсць малых інавацыйных прадпрыемстваў, якія атрымалі статус рэзідэнтаў РУП «Вучэбна-навукова-вытворчы цэнтр «Тэхналаб», з іх чатыры заснаваныя студэнтамі ўніверсітэта.

Аб'ём выраблены ў тэхнапарках прадукцыі склаў за мінулы год звыш за 17 мільёнаў рублёў, з іх інавацыйнай прадукцыі выпушчана на суму больш як 10 мільёнаў рублёў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асаблівая роля адводзіцца галіновым лабараторыям, якія функцыянуюць у інтарэсах міністэрстваў прамысловасці, архітэктуры і будаўніцтва, аховы здароўя, эканомікі, Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, канцэрна «Белнафтахім», іншых ведамстваў і міністэрстваў. Аб'ём работ, выкананых усімі галіновымі лабараторыямі, склаў за мінулы год больш чым 4,5 мільёна рублёў.

Знайсці і зацікавіць

— Далучэнне да навукі і падтрымка маладых людзей, якія абралі навуковы шлях, ажыццяўляецца па ўсім ланцужку: першая ступень вышэйшай адукацыі — магістратура — аспірантура. Калі на першай ступені студэнты галоўным чынам удзельнічаюць у канферэнцыях, выконваюць навуковыя даследаванні ў рамках студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый і навуковых таварыстваў, то ў аспірантуры суіскальнікі вучонай ступені, удзельнічаючы ў рэальных праектах дзяржаўных

праграм навуковых даследаванняў, грантах Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, уносяць істотны ўклад у развіццё новых ведаў, распрацоўваюць карысныя тэхналогіі і аб'екты, — расказаў Алег Бараноўскі.

Вясной 2020 года пры Міністэрстве адукацыі быў створаны Савет маладых навукоўцаў. Гэта кансультатыўна-дарадчы орган для выпрацоўкі рэкамендацый і прапаноў па ўдасканаленні дзяржаўнай падтрымкі маладых людзей, якія займаюцца навукай, і прызнання іх дасягненняў у навуковай сферы. Савет павінен стаць пастаяннай пляцоўкай для актыўнага абмеркавання актуальных праблем.

— Наша задача — яшчэ з першага курса зацікавіць студэнта, замацаваць яго ў навуковай дзейнасці і выхаваць з яго ўжо самастойнага, дасведчанага навукоўца, — падкрэсліваe **старшыня Савета маладых навукоўцаў Аляксей ЕРМАКОЎ.** — Трэба, каб як мага больш таленавітых маладых людзей заставалася ва ўніверсітэтах, займалася даследаваннямі, станавілася выкладчыкамі і вучонымі.

Паводле яго слоў, у савета два асноўныя кірункі работы: «Першы — прыцягненне моладзі ў навуку, зносіны са школьнікамі, папулярызацыя навукі і стварэнне іміджу маладога навукоўца. Другі кірунак — аказанне дапамогі аспірантам пры абароне кандыдацкіх работ. Задача Савета маладых навукоўцаў — кансультаванне моладзі, падрыхтоўка да абароны перад Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй, экспертным саветам. Я ведаю, што ў БДУ і БДПУ праходзяць «Тыдні аспірантаў». Мы хацелі б распаўсюдзіць іх станоўчы вопыт на ўсе ўніверсітэты краіны».

— Пошук перспектыўнай моладзі распачынаецца яшчэ ў школе, — падкрэслівае **прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Васіль САФОНАЎ,** — таму пры нашай ВНУ створаны «школы юных». Выкладчыкі працуюць з алімпіяднікамі, потым вызначаюць найлепшых, рыхтуюць іх для ўдзелу ў міжнародных спаборніцтвах. Затым, ужо прыйшоўшы ва ўніверсітэт, маладыя людзі далучаюцца і да навуковай дзейнасці. На розных факультэтах у нас працуе каля тысячы студэнцкіх гурткоў, дзейнічае больш за 40 навукова-даследчых лабараторый. І мы стараемся матэрыяльна падтрымліваць гэтыя даследаванні. Каля 600 студэнтаў і выкладчыкаў і шэсць навукова-даследчых лабараторый заахвочаны Спецфондам Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Прадугледжана сістэма грантаў і для аспірантаў. У тым ліку мы прадстаўляем нашых аспірантаў на конкурс Міністэрства адукацыі для атрымання грантавай падтрымкі. Акрамя таго, мы арыентуем моладзь на ўдзел у рэспубліканскіх конкурсах, дзе нашы маладыя навукоўцы паказваюць нядрэнныя вынікі.

У кастрычніку 2018 года БДУ запусціў свой першы ўніверсітэцкі спадарожнік. «У гэтым годзе да запуску рыхтуецца ўжо другі нанаспадарожнік. Такім чынам з'явіцца ўжо свая арбітальная групоўка. Гэта своеасаблівая лабараторыя, якая забяспечвае развіццё новых кірункаў у навучанні. Маладыя людзі, якія будуць вучыцца па кірунку «аэракасмічныя сістэмы», змогуць гэтыя спадарожнікі суправаджаць, змогуць атрымліваць ад іх інфармацыю, кіраваць імі. Студэнты таксама прыцягваюцца да стварэння нанаспадарожніка.

Камерцыялізацыя дзейнасці

Васіль Сафонаў падкрэсліў: складана назваць найбольш запатрабаваныя сферы навуковых даследаванняў. «Кожны чалавек сам вызначае для сябе, чым ён хоча займацца. Разам з тым добрыя вынікі ў нас ёсць у біятэхналагічнай і хімічнай сферах. Нашы маладыя навукоўцы займаюцца зялёнай хіміяй, распрацоўкай лекавых прэпаратаў. У нас ёсць маладыя хімікі, якія яшчэ ў студэнцкія гады ўдзельнічалі ў распрацоўцы медыцынскіх прэпаратаў, затым працавалі на іх апрабацыі, а цяпер удзельнічаюць у іх вытворчасці (размова ідзе пра супрацьпухлінныя і кардыятропныя прэпараты). Зараз працягваем работу над новай лінейкай прэпаратаў. Біятэхналагічны профіль — гэта распрацоўка ветпрэпаратаў. Нашымі біёлагамі распрацавана цікавая лінейка, звязаная з відавым лячэннем жывёл на аснове інтэрферонаў. Яны дапамагаюць актывізаваць імунную сістэму і паказваюць добрыя вынікі пры лячэнні жывёл. Усе гэтыя прэпараты распрацоўваюцца ў тым ліку з удзелам маладых навукоўцаў і вырабляюцца як на базе ўніверсітэта, так і з умовай перадачы па ліцэнзійных пагадненнях нашым партнёрам», — дадаў ён.

«Беларускія ўніверсітэты працягваюць развіваць узаемадзеянне з рэальным сектарам эканомікі».

— Калі створана неабходная інфраструктура, малады вучоны зможа рэалізаваць свае ідэі, — такой думкі прытрымліваецца **намеснік генеральнага дырэктара па інавацыйнай дзейнасці Навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік» Павел ЛУШЧЫК.** — Кожны малады навуковец хоча бачыць рэалізацыю сваіх навуковых ідэй і пачынанняў. І для гэтага неабходная інфраструктура. БНТУ развіваецца ў рамках канцэпцыі «Універсітэт 3.0», а гэта — не толькі адукацыйная і навуковая дзейнасць, але яшчэ стварэнне інавацыйных вытворчасцяў і камерцыялізацыя навуковай дзейнасці. За камерцыялізацыю навукі ў нашым універсітэце адказвае Навукова-тэхналагічны парк БНТУ «Палітэхнік». На сённяшні дзень намі ўжо створана некалькі інавацыйных вытворчасцяў у медыцынскай галіне (траўматалогіі, артапедыі, кардыяхірургіі, сасудзістай хірургіі і анкалогіі), у нанясенні шматфункцыянальных пакрыццяў, у вобласці энергаэфектыўных тэхналогій, а таксама стварэнні ачышчальных збудаванняў. На такіх вытворчасцях мы якраз выкарыстоўваем распрацоўкі, якія выйшлі з нашага ўніверсітэта, якія былі прыдуманы нашымі маладымі навукоўцамі і ўжо вопытнымі выкладчыкамі, прафесарамі, дактарамі навук.

Штогод у тэхнапарк размяркоўваецца каля дзесяці маладых спецыялістаў. Больш як сто штогод праходзіць там перадыпломную практыку.

— Асабліва часта праходзяць практыку студэнты з прыборабудаўнічага, механіка-тэхналагічнага, машынабудаўнічага і энергетычнага факультэтаў. На базе тэхнапарка створана лабараторыя хуткага прататыпавання. Акрамя таго, у БНТУ штогод праходзіць конкурс стартапаў, і на яго падставе выдзяляюцца гранты, — адзначыў намеснік гендырэктара. — Калі ёсць інфраструктура, дзе малады навуковец можа рэалізаваць свае ідэі, ёсць каманда і падтрымка, тады ўсё атрымаецца.

Фота прэс-службы БДУ.

Педагагічная майстэрня

ЁСЦЬ ЧЫМ ПАДЗЯЛІЦЦА? ЗРАБІ ГЭТА!

Стартаваў Рэспубліканскі сацыяльна-адукацыйны праект «Арыентацыя на будучыя пакаленні»

Яго каардынатарам выступае БДПУ пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне», Асацыяцыі кіраўнікоў устаноў адукацыі, вучэбна-навукова-інавацыйнага кластара бесперапыннай педагагічнай адукацыі і Асацыяцыі «Адукацыя для ўстойлівага развіцця».

Мэта праекта — удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці прадстаўнікоў педагагічнай супольнасці, абагульненне і дэманстрацыя эфектыўнага педагагічнага вопыту, стварэнне ўмоў для развіцця творчага патэнцыялу педагогаў.

Праект пройдзе ў дыстанцыйным фармаце. Да ўдзелу ў ім запрашаюцца педагогі, студэнты педагагічных спецыяльнасцяў і навучэнцы профільных класаў педагагічнай накіраванасці.

Мерапрыемства разлічана на тры этапы. Падрыхтоўчы ўключае рэгістрацыю ўдзельнікаў і ўстановчы семінар «Кампетэнцыі педагога XXI стагоддзя ў кантэксце адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця» (люты). Другі этап — рэалізацыя праекта: майстар-класы і тэматычныя семінары (сакавік — кастрычнік). Трэці — абагульненне: стварэнне тэматычнай пляцоўкі «Арыентацыя на будучыя пакаленні» ў рамках фестывалю інавацыйных практык, выданне зборніка матэрыялаў (кастрычнік — снежань).

Для ўдзелу ў праекце неабходна да 15 лютага запоўніць рэгістрацыйную форму на сайце Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Там жа можна азнаёміцца і з Палажэннем аб Рэспубліканскім сацыяльна-адукацыйным праекце «Арыентацыя на будучыя пакаленні».

Факт

ЭКСКЛЮЗІЎНЫ «КОРАНЬПЛЮС»

Сродак для раслін распрацавалі навукоўцы БДУ

Біяпрэпарат, які не мае аналагаў у Беларусі, прызначаны для стымуляцыі каранёвай сістэмы раслін, павышэння іх ураджайнасці і паляпшэння якасці пладоў. Ён падыходзіць для прымянення як на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу, так і на асабістых прысядзібных участках. У параўнанні з замежнымі аналагамі беларуская навацыя мае высокую эфектыўнасць і нізкі кошт. Распрацоўшчыкамі выступілі супрацоўнікі навукова-даследчай лабараторыі малекулярнай генетыкі і біятэхналогіі біялагічнага факультэта БДУ пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі Ірыны Фякліставай.

Біяпрэпарат «Кораньплюс» уяўляе сабой канцэнтрат суспензіі жывых клетак рызасферных бактэрый. Апошнія здольныя актываваць рост кораня і самой расліны. Для паліву расліны (пад корань) выкарыстоўваецца аднапрацэнтны водны раствор прэпарату.

Эфектыўнасць «Кораньплюсу» пацвердзілі палявыя даследаванні, праведзеныя на агароднінных культурах ахаванага і адкрытага грунту. Па выніках эксперыментаў адзначана павелічэнне ўраджайнасці агуркоў на 13,1 працэнта, капусты белакачаннай — на 8,8 працэнта. Сёлета біяпрэпарат будзе ўведзены ў серыйную вытворчасць. Стварэнне экалагічна бяспечных біясродкаў для стымуляцыі росту раслін і абароны сельскагаспадарчых культур ад узбуджальнікаў захворванняў сёння з'яўляецца актуальным навуковым кірункам у Беларусі.

Дарэчы, у Беларускім дзяржаўным універсітэце актыўна вядзецца распрацоўка розных па форме, тыпе і прымяненні бяспечных мікробных прэпаратаў для раслін.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Открытое акционерное общество «Молодечненский завод металлоизделий» (продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, расположенного по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Промышленная, 4, в составе:

Здания, ограждение, сети

Лот № 1. Изолированное помещение гальванического участка общей пл. 306,1 кв. м, инв. № 630/D-29945; ванны гальванические; виброустановка – 2 шт.; гальваническая линия цинкования до блеска; емкости 34 м³; калорифер (тэн 1,5 кВт – 6 шт.); кабельные линии с инв. № 4015; водопровод с инв. № 4020; канализация общего назначения с инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети с инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети с инв. № 4024; **Лот № 2.** Изолированное помещение гальванического участка общей пл. 427,3 кв. м, инв. № 630/D-47184; изолированное помещение сборочного участка общей площадью 382,4 кв. м, инв. № 630/D-29942; кабельные линии с инв. № 4015; водопровод с инв. № 4020; канализация общего назначения с инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети с инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети с инв. № 4024; **Лот № 3.** Котельная новая (в состав входят: котельная и склад красок) общей площадью 535,1 кв. м, инв. № 630/С-45429; подстанция общей площадью 38,8 кв. м, инв. № 630/С-45414; здание трансформаторной подстанции общей площадью 83,8 кв. м, инв. № 630/С-74599; трансформатор силовой 400/10/0,4; трансформатор силовой ТМЗ-630/10; камеры КСО-272 (14 шт.); кабельные линии с инв. № 4015; водопровод с инв. № 4020; канализация общего назначения с инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети с инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети с инв. № 4024; **Лот № 4.** Сварочный (токарно-штамповочный) цех (составные части: сварочный (токарно-штамповочный) цех, 2 холодные пристройки и сарай) общей площадью 947,8 кв. м, инв. № 630/С-45434; компрессор 2ВМ2,5-12/9; компрессор ВВ-10/8; компрессорная станция (компрессор ВП2-10/9М, машина точечной сварки МТР-280; кабельные линии с инв. по бух учету № 4015; кабель с инв. по бух учету № 4020; канализация общего назначения с инв. по бух учету № 4021; внутриплощадочные канализационные сети с инв. по бух учету № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети с инв. по бух учету № 4024. **Лот № 5.** Ангар (сварочный участок) (в состав входят: ангар (сварочный участок и холодная пристройка) общей площадью 1061,1 кв. м, инв. № 630/С-45438; кабельные линии с инв. № 4015; водопровод с инв. № 4020; канализация общего назначения с инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети с инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети с инв. № 4024; **Лот № 6.** Здание склада химии общей площадью 67,9 кв. м, инв. № 630/С-74598; **Лот № 7.** Центральная проходная общей площадью 46,8 кв. м, инв. № 630/С-45441; включая ограждение. Ворота электрические. Кабельные линии с инв. по бух учету № 4015; водопровод с инв. по бух учету № 4020; **Лот № 8**. Склад металла с инвентарным номером 630/С-45412 (в состав входят: склад для металла литер Л1/к и навес литер 12) общей площадью 679,9 кв. м, инв. № 630/С-45412; стеллажная эстакада; кабельные линии с инв. № 4015; водопровод с инв. № 4020; канализация общего назначения с инв. № 4021; внутриплощадочные канализационные сети с инв. № 4023; внутриплощадочные водопроводные сети с инв. № 4024; **Лот № 9.** Уборная, общей площадью 28,0 куб. м; **Транспорт лот № 10.** Автомобиль грузовой бортовой тентованный МАЗ 437043-328 регистрационный номер – А1 6022-5.

Станки и оборудование с лота № 11 по лот № 60

Земельный участок, на котором расположены объекты недвижимости: кадастровый номер 642000000002000542, общая площадь 2,4130 га, (доля в праве) расположен по адресу: г. Молодечно, ул. Промышленная, д. 4. Назначение: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, а так же подробная информация об имуществе, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайтах:

1) www.minsk-region.gov.by в разделе Работа с инвесторами «Одно окно» (Раздел 5. Аукционы по продаже недвижимости), 2) www.molodechno.minsk-region.by/ru/economy/aukcion в разделе «Аукцион».

Аукцион состоится **16.02.2021 г.** в 11.00 по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Промышленная, 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **15.02.2021 г.** в рабочие дни до 15.00 по указанному адресу. Тел: +375 29 6853677.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 24-63-12.

Продавец: общество с ограниченной ответственностью «БЕЛГАЗПРОЕКТ» 210017, г. Витебск, ул. Гагарина, 24/2 3-й этаж административно-бытового корпуса, +375 (212) 263127, + 375333111145.

Лот № 1. «Временный заправочный пункт сжиженного газа на базе передвижного автозаправщика в г. Витебске», инв. № 0045, в том числе полуприцеп-топливозаправщик АППЦ-9611ТН на базе седельного тягача ЗИЛ-442160 (полуприцеп не зарегистрирован в ГАИ), помещение заправщика в виде модульного передвижного вагончика, размеры 160х480 см, газовая заправочная колонка, тип – 120, сер. № 227751/10012. Месторасположение имущества: Витебская область, г. Витебск, район котельной «Южная».

Нач. цена: 195 398,59 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 19 539, 85 бел. руб.

Лот № 2. Дебиторская задолженность ООО «БЕЛГАЗПРОЕКТ». Дебитор – гражданин Республики Беларусь Цыганков Николай Николаевич, зарегистрированный по адресу: г. Витебск, ул. Лазо, д. 103, корп. 1, кв. 37, идентификационный номер 3191069E014PB2, по договору займа от 18.03.2011 на сумму 19 536,00 бел. руб. Остаток долга – 17 756,00 бел. руб., проценты за пользование заемными средствами по состоянию на 31.12.2020 – 5102,10 бел. руб. Срок предоставления займа – до 22.03.2021. Нач. цена: 22 858,10 бел. руб. без НДС. Задаток: 2285,81 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 10.03.2021 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи заявлений:** с 08.02.2021 с 8.30 по 09.03.2021 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.**

Шаг аукциона устанавливается в сумме 5 % от начальной цены лота. **Условия аукциона по лотам № 1 и № 2**: Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов. **Лот № 1:** в течение 5 (пяти) дней с даты проведения торгов возместить затраты на проведение независимой оценки в сумме 200,00 бел. руб. без НДС; в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС сверх цены продажи; покупатель обязан иметь соответствующие разрешения для работы с опасными объектами. **Лот № 2**: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения торгов подписать договор уступки права требования; оплатить предмет торгов и возместить продавцу подоходный налог в сумме 2130,72 бел. руб. в порядки и сроки, установленные договором уступки права требования.

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; заключить с Организатором договор о задатке; юр. лицом – резидентом РБ – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении гос. регистрации, и свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юр. лица (если юр. лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор либо иные документы в соответствии с законодательством); юр. лицом, иной организацией – нерезидентом РБ – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем – резидентом РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивидуальным предпринимателем – нерезидентом РБ – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина РБ, индивидуального предпринимателя – резидента РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя - нерезидента РБ – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за три дня до даты их проведения. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. **Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 3111145.**

ООО «Деловая оценка»
(организатор аукциона) по поручению
ОАО «СтанкоГомель»
(продавец)
извещает о проведении 12 марта 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 12.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

ЛОТ № 1: капитальное строение с инвентарным номером 350/С-67428, площадью 432,9 кв. м, наименование – здание РМЦ, назначение – здание многофункциональное. Составные части и принадлежности: три пристройки, автомобильные дороги завода, кирпичный забор – 14,11 м, железобетонный забор – 18,12 м
Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Интернациональная, 10Б
Информация о земельном участке: кадастровый номер 340100000001006400, площадь – 0,0843 га
Начальная цена продажи с учетом НДС: 623 400,00 бел. рубля
Задаток (5 %) с учетом НДС: 31 170 бел. рубля

Продавец: ОАО «СтанкоГомель», г. Гомель, ул. Интернациональная, 10. Контактный телефон +375 44 775-83-41.

Шаг аукциона – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца: р/с BY28AKBB30120363500253100000** в филиале № 300 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, **ОКПО 05802968, УНП 400085002.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 09.03.2021 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Для участия в аукционе предоставляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в следующем порядке: 60 % стоимости в течение 10 календарных дней с момента подписания договора, оставшаяся сумма выплачивается тремя равными долями ежемесячно до 20 числа месяца, следующего за месяцем оплаты первого этапа. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение в размере 2,5 % от цены продажи предмета аукциона организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости объекта. Дополнительно сообщаем, что ОАО «СтанкоГомель» заключены договора аренды с ОДО «Нестерка» и Первичной профсоюзной организацией открытого акционерного общества «СтанкоГомель». Предметы договора – нежилые помещения с изолированным выходом на ул. Интернациональную, общей площадью 265,2 кв. м. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский литейный завод «ЦЕНТРОЛИТ», тел. 8 (044) 544 38 37

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	Оздоровительный лагерь «Литейщик», расположенный по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, 4 в составе: - капитальное строение (скважина артезианская) с инв. № 310/С-48017 начальной стоимостью 11 400,00 руб. с НДС; - капитальное строение (скважина артезианская) с инв. № 310/1-48018 начальной стоимостью 31 700,00 руб. с НДС; - капитальное строение (здание спального корпуса № 1) с инв. № 310/С-49810, общей площадью 230,5 кв. м начальной стоимостью 41 600,00 руб. с НДС; - капитальное строение (здание спального корпуса № 3) с инв. № 310/С-49811, общей площадью 101,5 кв. м начальной стоимостью 8 000,00 руб. с НДС; - капитальное строение (здание изолятора) с инв. № 310/С-49813, общей площадью 73,2 кв. м начальной стоимостью 16 600,00 руб. с НДС; - капитальное строение (здание летней эстрады) с инв. № 310/С-49814, общей площадью 240,8 кв. м начальной стоимостью 19 200,00 руб. с НДС; - капитальное строение (здание уборной (туалет) с инв. № 310/С-49815, общей площадью 42,7 кв. м начальной стоимостью 7 700,00 руб. с НДС; - капитальное строение (тепловая сеть) с инв. № 310/С-68107, протяженностью 287,5 м начальной стоимостью 20 100,00 руб. с НДС; - капитальное строение (профилакторий на 100 мест) с инв. № 310/С-46344, общей площадью 3107,9 кв. м начальной стоимостью 701 211,68 руб. с НДС; - капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 310/С-48013, общей площадью 41,1 кв. м начальной стоимостью 3 680,33 руб. с НДС; - капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 310/С-48014, общей площадью 22,6 кв. м начальной стоимостью 15 395,30 руб. с НДС; - капитальное строение (здание котельной) с инв. № 310/С-48015, общей площадью 235,5 кв. м начальной стоимостью 42 005,56 руб. с НДС; - капитальное строение (здание овощехранилища) с инв. № 310/С-48016, общей площадью 60,9 кв. м начальной стоимостью 8 106,40 руб. с НДС; - Капитальное строение (здание столовой) с инв. № 310/С-49812, общей площадью 280,9 кв. м начальной стоимостью 31 354,75 руб. с НДС; - капитальное строение (кабельная линия освещения) с инв. № 310/С-68102, протяженностью 147,1 кв. м начальной стоимостью 526,84 руб. с НДС; - капитальное строение (сети канализации) с инв. № 310/С-68106, протяженностью 397,1 м начальной стоимостью 5 887,80 руб. с НДС; - капитальное строение (высоковольтная кабельная линия) с инв. № 310/С-68103, протяженностью 310,8 м начальной стоимостью 7 025,87 руб. с НДС; - капитальное строение (высоковольтная кабельная линия) с инв. № 310/С-68104, протяженностью 773,6 м начальной стоимостью 4 211,46 руб. с НДС; - капитальное строение (сети водопровода) с инв. № 310/С-68105, протяженностью 413,7 м начальной стоимостью 9 022,85 руб. с НДС. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 321085200001000071. - Лифт ПГ-241 (инв. 4192) начальной стоимостью 1300,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4166) начальной стоимостью 210,00 руб. с НДС; - трансформаторная подстанция (инв. 4167) начальной стоимостью 300,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4168) начальной стоимостью 440,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4169) начальной стоимостью 440,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4170) начальной стоимостью 440,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4171) начальной стоимостью 440,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4172) начальной стоимостью 70,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4173) начальной стоимостью 100,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4177) начальной стоимостью 210,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4178) начальной стоимостью 170,00 руб. с НДС; - пункт распределительный (инв. 4180) начальной стоимостью 170,00 руб. с НДС; - щит низковольтный ЩО (инв. 4276) начальной стоимостью 20,00 руб. с НДС; - распределительный пункт (инв. 4280) начальной стоимостью 20,00 руб. с НДС; - трансформаторная подстанция КНТН-400 (инв. 2100) начальной стоимостью 1 500,00 руб. с НДС; - трансформатор ТМ 160/10 (инв. 4551) начальной стоимостью 650,00 руб. с НДС; - трансформатор ТМ 250/01 (инв. 4550) начальной стоимостью 860,00 руб. с НДС.	**992 068,84**	**99 206,88**
2	Котельная установка (инв. 4165), находящаяся по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, 4/1 (в капитальном строении с инв. № 310/С-48015 (здание котельной)	**168 000,00**	**16 800,00**

Срок подачи заявления	**по 09 марта 2021 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время, место проведения аукциона	**11 марта 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете ***«Звязда» от 06.02.2021 г.***
Условия продажи	Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость лота, сформированную на аукционе в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. ***Необходимые условия для Победителя аукциона по лоту № 1*** – обеспечить беспрепятственный доступ (проезд, проход) к капитальному строению с инвентарным номером № 310/С-47658 (здание КНС), расположенному по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, 4/3; – обеспечить транзит электроэнергии и водоснабжения к существующим потребителям. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.

9. Аукцион проводиться в соответствие с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация».

МАЁМАСЦЬ У СВАБОДНЫМ ДОСТУПЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Некалькі гадоў таму мне давялося пісаць пра даволі кур'ёзны выпадак у адным з брэсцкіх двароў. Там нейкая дама нават не з сабачкам, а з двума сабачкамі надзвычай каштоўных парод пазнаёмілася з выпадковымі, але вясёлымі хлопцамі. Яны шчодра пачаставалі даму гарэлкай, а калі ўпэўніліся, што яна не ў стане хутка пабегчы за імі, забралі сабак за павадкі і ўцяклі. Злёгку працверазеўшы, яна прыбегла ў міліцыю, патрабавала знайсці злодзеяў, сабакі ж былі даволі дарагія. Той крадзеж раскрылі, бо выкрадальнікі жылі не так далёка. А каб яны былі, скажам, іншагароднія, пасадзілі ў машыну жывы тавар і з'ехалі, наўрад ці ўбачыла б яна больш сваіх гадаванцаў.

А сёлета ад сябра-сабутэльніка пацярпела яе прыкладна равесніца. І верыла ж гэтаму злыдню, можна сказаць, да апошняга, не хацела на яго скардзіцца. Але ж, як вядома, і анёльскаму цярпенню некалі прыходзіць канец... Гэты краў не сабак, а пярсцёнкі і завушніцы з каштоўнымі камянямі. Іх пазнаёмілі сябры, і 26-гадовы малады чалавек стаў часта бываць у новай 40-гадовай сяброўкі. Ён ведаў, дзе яна захоўвае ўпрыгажэнні, і аднойчы паціху забраў іх ды занёс у ламбард. Калі жанчына даведалася пра гнюсны ўчынак, то заяўляць ў міліцыю не стала, пашкадавала. Ён жа мае судзімасць, яе заява аўтаматычна азначала б новы тэрмін зняволення. Адным словам, сама пайшла ў той ламбард і выкупіла свае рэчы. Думала, ён усвядоміць, будзе ўдзячны. Ён і рабіў такі выгляд, у нагах валяўся. Прабачэння прасіў... А сам тым часам падабраў танную біжутэрыю, падобную на каштоўнасці сваёй прыяцелькі, і замяніў ёю арыгіналы. Ну а іх, як вы зразумелі, зноў аддаў пад залог. Гэтым разам яна ўчыніла скандал, запатрабавала вярнуць рэчы, а калі ён не зрабіў гэта, напісала заяву. Мараль гэтай байкі відавочная — трэба выбіраць знаёмых з розумам, як сабутэльнікаў так і кавалераў.

Махляры ў масках

Шмат і на ўсіх узроўнях гаворыцца пра недастатковую пільнасць пажылых грамадзян, з-за якой яны неаднойчы становяцца ахвярамі прадпрымальных злыдняў. Але ж бабулі з дзядулямі заўсёды рады новаму суразмоўцу, нярэдка пакутуюць ад недахопу стасункаў, нават калі яны жывуць не ў аддаленай вёсцы, а ў даволі вялікім горадзе. Ды і не так лёгка зразумець, хто перад табой: чалавек з добрай душой ці адпеты прайдзісвет, асабліва калі твар прыкрыты маскай. Махлярам гэты масачны рэжым як падарунак нябёсаў. Прыкрыюць свой бессаромны твар і стукаюць у дзверы да старых.

Адна такая ў кастрычніку пазваніла ў дзверы прыватнага дома да 90-гадовай жыхаркі Баранавіч. Незнаёмка адрэкамендавалася супрацоўніцай Брэсцкага аблвыканкама, стала гаварыць пра дабрачынную акцыю для пажылых людзей, паказваць спіс прозвішчаў людзей, якіх трэба наведаць «супрацоўніцы» з падарункамі. Пенсіянерка пусціла візіцёрку ў дом. І скарыстаўшыся прысутнасцю маладой ды здаровай кабеты, папрасіла яе адкрыць слоік з агуркамі, бо сама займалася гэтым пару хвілін таму, але не вельмі атрымлівалася. Госця з задавальненнем дапамагла старой. Гэта спатрэбілася потым крыміналістам.

Адкрыўшы агуркі, «дабрачынніца» стала выцягваць з пакета адзенне з прапановай прымераць і пакінуць тое, што падыдзе. Пажылая жанчына трохі сумелася: па-першае, фасоны былі не зусім яе, а па-другое, адзенне і так хапае. Ёй бы тут насцярожыцца, але ўмелая маніпулятарка разыгрывала партыю нібы па нотах, да таго ж вельмі хутка. Яна сказала, што пенсіянерка можа пакінуць усё адзенне, яно ж новае, потым старая разбярэцца, каму падарыць, а ўзамен папрасіла толькі невялікі ўзнос у памеры пяці рублёў. Калі пажылая жанчына зайшла ў другі пакой, дастала з шафы пакет з грашыма, дастала купюру, зламысніца ўвесь час хадзіла за ёй, збівала з толку, блытала іншымі просьбамі і камандамі: то трэба было распісацца ў ведамасці, то нешта зверыць, то ёй самой знайсці здачу. А потым выбрала момант, паказала рукой убок, і калі жанчына павярнула галаву, выхапіла пакет з грашыма, а старую моцна адштурхнула. Добра, што ў Ніны С. побач стаялі хадункі, і яна паспела за іх ухапіцца, бо падзенне пагражала б інваліду другой групы сур'ёзнымі наступствамі для здароўя.

Калі пенсіянерка крыху ачомалася, зразумела, што махлярка ўкрала 500 рублёў, яна пачала крычаць, клікаць на дапамогу. Яе пачулі рабочыя, што побач рамантавалі дарогу, яны і выклікалі міліцыю.

Тады і спатрэбіўся слоік з агуркамі, які візіцёрка ўслужліва адкрыла, каб усыпіць пільнасць ахвяры. «Пальчыкі» зладзейкі былі ў базе. Аказалася, што 41-гадовая беспрацоўная шматдзетная маці ўжо не раз сядзела за крадзяжы, махлярства, рабаўніцтва. Калі да яе наведаліся аператыўнікі, яна моцна спала пасля добрай дозы спіртнога, у такім жа стане быў і муж. Частку грошай яны паспелі прапіць. Рабаўніца была затрыманая, заведзена крымінальная справа, чарговая ў яе біяграфіі.

На прыкладзе гэтай справы супрацоўнікі аддзелаў унутраных спраў зноў нагадваюць пажылым людзям аб тым, што не трэба пускаць у дом медыцынскіх работнікаў, работнікаў сацыяльных і іншых службаў, не ўпэўніўшыся ў іх сапраўдным дачыненні да названых службаў. Для гэтага пад рукой павінны быць тэлефоны названых арганізацый, каб праверыць законнасць візіту супрацоўніка. У іншым выпадку можна папрасіць візіцёра зайсці пазней, калі дома будуць маладзейшыя члены сям'і.

Пад матрацам — ненадзейна

У Брэсце ў канцы мінулага года затрымалі групу серыйных злодзеяў, якія мэтанакіравана ішлі ў прыватны дом і выносілі толькі грошы і каштоўнасці. Такім чынам у адной брастаўчанкі з дому вынеслі 7 тысяч долараў, 1,4 тысячы еўра, 100 тысяч расійскіх рублёў, упрыгажэнні. У другой заяўніцы ўкралі амаль 1,7 тысячы ўмоўных адзінак. Абедзве жанчыны, выходзячы з дому, не ўключылі ахоўную сігналізацыю.

Двое раней асуджаных зламыснікаў дзейнічалі вельмі акуратна. Яны пранікалі ў дом, як правіла, праз веранду і не пакідалі ніякіх слядоў. Пацярпелыя нават не адразу заўважалі прапажу. А злодзеі бралі толькі грошы і каштоўнасці. У гэтай сувязі праваахоўнікі папярэджваюць, што злодзеі найперш правяраюць шафы, шукаюць схованкі сярод адзення і пасцельнай бялізны, абследуюць тумбачкі і ложкі, шукаюць грошы пад матрацамі, затым правяраюць антрэсолі, на паліцах шнораць сярод кніг. Таму грошы ўсё ж надзейна захоўваць у банку альбо прыдумваць адмысловыя схованкі, якія злодзею не прыйдуць у галаву.

Яшчэ на што звярнулі асаблівую ўвагу ў аддзяленні грамадскіх сувязяў УУС, гэта на неабходнасць паклапаціцца пра маёмасць у дачных дамах. Гаспадары, як правіла, закрыюць дом у садовым таварыстве на замок і не наведваюць яго ўсю зіму. А зладзюжкі тым і карыстаюцца, іх здабычай становяцца бытавая тэхніка і электрапрыборы, прадукты харчавання, вырабы з металу, газавыя балоны. У асобных выпадках цягнуць нават мэблю, забіраюць пасцельную бялізну і адзенне. Дапамагчы можа ахоўная сігналізацыя альбо надзейныя дзверы з замкамі, а на вокны давядзецца мацаваць аканіцы альбо металічныя рашоткі. Да таго ж дарагую тэхніку і інструмент лепш забіраць на зімовы сезон у горад, каб не спакушаць зламыснікаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Гучная справа

Суд па справе топ-менеджараў Белгазпрамбанка пачнецца 17 лютага

Такая інфармацыя агучана па выніках папярэдняга судовага пасяджэння, якое прайшло ў судзе Маскоўскага раёна Мінска, паведаміла БелТА.

Як заўважыў суддзя Вярхоўнага суда Ігар Любавіцкі, меру стрымання абвінавачаным пакінуць без змянення. Падчас пасяджэння ўстаноўлена, што дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве з абвінавачанымі Бадзеем, Дабралётам, Кузьмічом, Ільясюком, Шабаном, Кабяком заключана добраахвотна і пры ўдзеле іх абаронцаў. Пракурор пацвердзіў выкананне абвінавачанымі абавязацельстваў па аказанні садзейнічання папярэдняму следству ў расследаванні злачынства, а таксама па выплаце даходу, здабытага злачынным шляхам.

Як паведамлялася, былы старшыня праўлення Белгазпрамбанка Віктар Бабарыка абвінавачваецца ў атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры арганізаванай групай і легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, у асабліва буйным памеры. Шэсць іншых былых топ-менеджараў Белгазпрамбанка і адначасова намеснікаў Бабарыкі абвінавачваюцца ў атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры арганізаванай групай. Крымінальны пераслед ажыццяўляецца і ў дачыненні да саўладальніка і кіраўніка ТАА «Актыўлізінг» за дачу хабару службовым асобам Белгазпрамбанка ў буйным памеры на суму не менш як $2,5 млн.

Пры расследаванні ўстаноўлена, што Бабарыка, калі быў старшынёй праўлення Белгазпрамбанка, з мэтай сістэматычнага атрымання незаконных грашовых узнагарод ад камерцыйных арганізацый стварыў з ліку сваіх намеснікаў арганізаваную групу. Дадзеная група з 1 студзеня 2004 года да 11 чэрвеня 2020-га незаконна атрымлівала ад прадстаўнікоў камерцыйных арганізацый грашовыя сродкі на суму не менш як Br30 млн 491 тысяч.

Працягваючы злачынную дзейнасць, Віктар Бабарыка з 10 лістапада па 27 снежня 2018 года для надання правамернасці валоданню, карыстанню і распараджэнню грашовымі сродкамі, заведама атрыманымі злачынным шляхам, здзейсніў фінансавыя аперацыі па набыцці размешчаных у Мінску двух капітальных будынкаў на суму звыш Br1 млн і іншай маёмасці.

Віну ў інкрымінаваных злачынствах абвінавачаныя, акрамя Бабарыкі, прызналі цалкам. «Віктар Бабарыка жыве ў нейкім іншым вымярэнні і не беражэ сваіх людзей», — такое меркаванне журналістам выказаў палітолаг Юрый Васкрасенскі, паведаміла БелТА. «Прэзідэнт на круглым стале яму прапанаваў раскаяцца і вярнуць усё краіне і народу. І калі б ён бярог сваіх людзей (а мы ведаем, што зараз судзяць менавіта яго каманду) , ён бы зрабіў усё, каб іх выратаваць і каб сем'і гэтых людзей не пакутавалі з-за яго. Але ён, магчыма, лічыць сябе месіяй і хоча кагосьці там выратаваць, але не можа выратаваць нават сваіх людзей», — заўважыў Юрый Васкрасенскі.

На слыху

РЫБАКІ ЗАБЛУКАЛІ Ў ЛЕСЕ

У 19.15 у службу выратавання па тэлефоне «101» ад грамадзяніна паступіла паведамленне аб тым, што ў лясным масіве каля вёскі Ляхавічы Жыткавіцкага раёна згубіліся два чалавекі.

На іх пошукі былі накіраваны ратавальнікі пажарнага аварыйна-выратавальнага паста № 13 Жыткавіцкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, работнікі міліцыі і лясгаса.

Прыбыўшы на месца, яны ўстанавілі, што мужчыны вудзілі на возеры Чырвонае, пасля чаго каля 17.00 накіраваліся да аўтамабіля і заблукалі, паведамляе МНС.

Неўзабаве рыбакі былі знойдзены камандзірам аддзялення Юрыем Ржэускім і кіроўцам Сяргеем Краўчуком. Стан мужчын быў здавальняючы, у медыцынскай дапамозе яны патрэбы не мелі.

ЗАБРАЎ З КАВЯРНІ ЧУЖЫ БУКЕТ РУЖ

У Барысаве ў міліцыю звярнуўся 25-гадовы мясцовы жыхар — у адной з забаўляльных установ горада ў яго ўкралі букет са 101 ружы.

У той дзень малады чалавек адзначаў у кавярні юбілей свайго свая-ка. Там жа, карыстаючыся момантам, вырашыў зрабіць прапанову рукі і сэрца сваёй выбранніцы, уласна кажучы, свае планы барысаўчанін ажыццявіў, паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Барысаўскага РАУС.

Пасля ўрачыстага моманту букет пакінулі на выхадзе з установы, каб той не перашкаджаў. І толькі бліжэй да поўначы госці заўважылі, што кветкі непрыкметна зніклі.

Супрацоўнікам крымінальнага вышуку спатрэбілася пару гадзін, каб высветліць, што адбылося і хто мае дачыненне да крадзяжу. Аказалася, на чужое паклаў вока 35-гадовы наведвальнік більярднай, якая знаходзіцца ў суседнім памяшканні. Калі мужчына надумаў сыходзіць, убачыў каля дзвярэй кавярні ў вядры белыя ружы і вырашыў забраць букет з сабой.

Дарэчы, шлях да дома зламысніка паказалі апалыя пялёсткі руж.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 4 (530)

Невядомае пра вядомых

10 знакавых мясцін

Нават падчас круізу вакол Еўропы

«ХАТЫ былі на востраве. Востраў гэты, праўда, не кожны прызнаў бы за востраў — аб яго не плёскаліся ні марскія, ні нават азёрныя хвалі. Навокал адно гніла куп'істая дрыгва ды моклі панурыя лясы.»

Пазналі першы абзац самага, мабыць, вядомага твора беларускай літаратуры? Нават калі забыліся — можна здагадацца: «Людзі на балоце». Першы раман «Палескай хронікі» народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. «Людзі на балоце» — вобраз настолькі пазнавальны, што яго ведаюць нават далёкія ад беларускай літаратуры. Цяжка даць веры, што калі Мележ прынёс рукапіс у рэдакцыю часопіса «Полымя», у яго было пятнаццаць варыянтаў загалоўкаў. Вылучаў два: адзін нам знаёмы, а другі — «Туманы над багнай». Уявіце, каб Мележ спыніўся на гэтай назве, чаго мы пазбавіліся б!..

Мемарыяльная дошка на доме па вуліцы Янкі Купалы ў Мінску.

8 лютага Івану Мележу спаўняецца 100 гадоў. На так шмат наканавана яму было жыць і працаваць, памёр у 55. Але паспеў пападарожнічаць, і па створаным уяўленнем свеце, і па рэальным. Нават патрапіў у лік шчасліўчыкаў, якія на самым пачатку «адлігі», 4 ліпеня 1956 года, адправіліся з Ленінграда ў круіз вакол усёй Еўропы на цеплаходзе «Перамога» — менавіта пра той круіз фільм Гайдая «Брыльянтавая рука». Прычым Іван Мележ быў прызначаны старшым беларускай групы. Рым, Парыж, Амстэрдам, Стакгольм, Афіны... Вандроўка мары! Але ў падарожных нататках «Ліпень у дарозе» — абавязковай творчай справаздачы — аўтар, вядома, мусіў пільнавацца ідэалагічнай чысціні, не забываючы адпаведным чынам выказвацца: «Частка галандцаў вымушана гібець да сённяшняга дня на вадзе, у пабудовах, падобных ні то на баржы, ні то на лодкі». Ці не праўда, гучыць, як адсылка да «Людзей на балоце»? А паколькі працу над гэтым раманам Мележ якраз і пачаў, вярнуўшыся з еўрапейскіх прасторaў, ці не ўспамінаў, сузіраючы амстэрдамскія каналы ды змаганне тамтэйшых людзей з вадою, роднае Палессе, параўноўваў з галандскімі рэаліямі... Але найбольш сілкавалі ягоныя творы ўсё-ткі іншыя падарожжы. Давайце наведаем разам з класікам дзесяць мясцін, якія пакінулі след у ягоным жыцці і ў ягоных творах.

1. ГЛІНІШЧА. Верталёт на школьным стадыёне

«Мяне як пісьменніка больш за ўсё сфарміравала іменна гэтае жыццё: Глінішча, Алексічы, Хойнікі, — вясковае, калгаснае жыццё, камсамольскае жыццё, школьнае жыццё».

Вядома ж, пачаць трэба з Глінішча — роднай вёскі Мележа, той, якую ён назаўсёды ўвекавечыў у «Палескай хроніцы». Гэта там «Людзі заўсёды чым-небудзь былі заняты: уранку і ўвечары, летам і зімою, у хаце, на двары, у полі, на балоце, у лесе...» Ёсць у ваколіцах Глінішча ігруша, пад якою сустракаліся героі рамана Ганна і Васіль. І сёння вам пакажуць возера, у якім хацела ўтапіцца іншая гераіня, Хадоська.

Мележ вельмі любіў бываць у роднай вёсцы. Пасля вайны, падчас якой Глінішча было спаленае, дапамагаў сваякам будавацца. І сам шчыраваў — хоць пасля раненя валодаў добра толькі адной рукой. Дарэчы, як сцвярджае дачка пісьменніка Ларыса Мележ, у сям'і існавала паданне — што род Мележаў паходзіць ад чэшскага збяднелага арыстакрата, які вучыўся з сынам мясцовага памешчыка ў Пражскім універсітэце, прыехаў з ім на Беларусь у якасці рэпетытара, закахаўся ў мясцовую дзяўчыну дый застаўся тут. Прынамсі, бацька Івана Мележа быў чалавек адукаваны і начытаны, сына настройваў, што трэба паступаць ва ўніверсітэт. Іван Мележ не аднойчы ўспамінаў пра воз кніг, які яму ў дзяцінстве прывёз у падарунак бацька.

Музей Мележа ў Глінішчы.

Апошні раз Іван Мележ пабачыўся з землякамі незадоўга да сваёй смерці, у маі 1976 года. Ён быў ужо вельмі хворы. І Пётр Машэраў, які тады стаяў на чале рэспубліканскай кампартыі, вырашыў зрабіць падарунак пісьменніку, якога вельмі паважаў. Папрасіў паказаць на карце, дзе ж тое Глінішча... І даў свой верталёт, каб адвезці Івана Мележа з групай іншых пісьменнікаў туды. Верталёт прызямліўся проста на школьным стадыёне. Вядома ж, людзі збегліся з усяго навакольля.

2. КАРАНЁЎКА. Млын і дзед Васіль

Яшчэ адна дарагая Мележу мясціна — радзіма ягонай маці, вёска Каранёўка. Паэт Мікола Мятліцкі піша: *«Я бываў не раз у Каранёўцы, той вёсачцы за Глінішчам, якая і стала ў Мележа Куранямі, і бачыў на свае вочы: як геаграфічна дакладна ўвайшла яна ў «Палескую хроніку». Там ёсць і тая ж дарога на сенажаць, і тыя ж грушы на былых загуменнях, і тое ж поле каля цагельні. Дый тое ж не меней гразкае ў разводдзе і дажджы ўзбалоцце, дзе куранёўцы будавалі грэблю ў бок Алешнікаў — Алексіч. Дый прозвішчы ў Каранёўцы тыя ж, раманныя — Глушакі, Зайчыкі, Дзятлы»...*

Сваячка Мележа Тамара Аляхновіч успамінала: *«Ваня з дзяцінства быў дапытлівы хлопчык. За нашай вёскай знаходзіўся ветраны млын, які вабіў яго надзвычай цікавымі крыламі. У тры гады ён часта хадзіў туды адзін, каб яшчэ і яшчэ раз палюбавацца гэтым цудам. А аднойчы... пайшоў да нашага дзеда Дзяніса ў Каранёўку праз лес за пяць кіламетраў. Дзядулю Ваня вельмі любіў за тое, што ён быў добрым чалавекам, незвычайным майстрам-казачнікам, іграў на скрыпцы».*

Дарэчы, згаданы млын і належаў дзядулю Васілю. Ларыса Мележ успамінае расповед бацькі, як раскулачвалі дзеда. Дом забралі напачатку зімы, сям'ю выселілі ў маленькі халодны хлеў. А што запомнілася — невядома навошта вынеслі ў сад добры дубовы стол і пасеклі сякерай.

Дарэчы, аднойчы маленькі Іван схітрыўся ўхапіцца за крыло ветрака і падняўся даволі высока... А калі ўпаў, доўга не мог аддыхацца.

3. АЛЕКСІЧЫ. Міканорава грэбля

Яшчэ адна вёска, апісаная ў «Палескай хроніцы», — Алексічы. Аўтар толькі трохі змяніў назву — на Алешнікі. Менавіта тут тры гады, з пятага па сёмы клас, давялося вучыцца ў школе і кожны дзень адмяраць доўгую дарогу. *«Мераў кожны дзень — і ў студзеньскі сівер, і ў красавіцкае разводдзе, калі, дабраўшыся да ганка школы, чуў, як вада хлюпае ў лапцях, абцінае горача анучы. Цяпер сам здзіўляюся той — ад бацькоў і дзядоў, пэўне, — цярплівасці, з якой тады браў усе нягоды: не толькі не наракаў калі-небудзь, але нібы і не заўважаў іх. Маці потым, помню, дзівілася, са спачуваннем і задавальненнем: кожны дзень, ва ўсякае надвор'е, мокры, скалелы, у школу, са школы!»*

У жніўні 1942 года Алексічы былі спаленыя гітлераўцамі. *«Глінішча немцы спалілі як бы гуляючы, а к Алексічам і Каранёўцы прыкацілі — годам раней — з вялікаю сілаю, з гарматамі і кулямётамі, з падраздзяленнямі аўтаматчыкаў-людаедаў, — помсцячы за дружбу людзей з партызанамі, акружылі вёскі, пратупацелі шалёнай гайнёю з агнём, з выбухамі гранат, з аўтаматнымі чэргамі па дварах, па хатах, па полі — не абмінулі ні старых, ні груднога дзіцяці. Доўга-доўга звозілі людзі з навакольных вёсак трупы, збіралі абгаркі касцей у попеле пажарышчаў...»* — піша Мележ.

Іван Мележ з бацькам у Глінішчы.

Свайму сябру Янку Казеку Мележ паказаў апісаную ў рамане «Міканораву грэблю», пракладзеную праз балота паміж Каранёўкай і Алексічамі. Вазіў Мележ сюды і Міколу Аўрамчыка: *«Звычайна, калі мы з Іванам прыязджалі ў гэтыя мясціны, ён ні разу не вёз мяне праз Алексічы. Абмінаў іх па дарозе ўзбалоткам, як калісьці Васіль, вяртаючыся з Юравіч з-пад арышту. Відаць, не хацеў вярэдзіць успамінамі шматлікія даўнія раны».*

А яшчэ кажуць, што вобраз Ганны Чарнушкі спалучыў у сабе рысы двух рэальных прататыпаў. Гэта цётка празаіка, сястра ягонай маці з Каранёўкі, а яшчэ — аднакласніца Мележа ў Алексічах Алеся Бондар, якая пасля сямігодкі скончыла педтэхнікум і стала настаўніцай. Кажуць, што Іван вельмі сябраваў з Алесяй, было першае каханне, але разлучыла вайна.

Мележ збіраўся напісаць пра перажытае жыхарамі Алексіч, але не паспеў.

4. ХОЙНІКІ. Ноч у чарзе па цукар

Наведаем яшчэ адну мясціну — Хойнікі, дзе зараз стаіць скульптурная група герояў «Палескай хронікі». Тут Іван Мележ заканчваў школу. Менавіта падчас навучання ў Хойніках пачаў друкаваць вершы ў раённай газеце «Ленінскі сцяг».

Але час той быў нярадасны. Жонка Мележа, Лідзія Якаўлеўна, піша: *«З сумам успамінаў гады вучобы ў Хойніках. У дзённіку за 30 кастрычніка запісана: «Жыццё... Успамінаю 1935-ы год, калі я ўсю ноч цалкам стаяў у кутняй краме на Савецкай, каб, атрымаўшы кілаграм цукру, спяшацца ў школу. Паўпрытомны стан ад недаядання, калі вочы перастаўлялі бачыць. Халодны ложак ля замерзлага акна, нацягнутае з галавой паліто». Расказваў, што жыў на кватэры ў далёкіх сваякоў, спаў на цвёрдай лаве ці ў кухні, ці ў калідоры пад халодным акном, зарабляў грошы тым, што дапамагаў сыну настаўніка выконваць хатнія ўрокі, быў рэпетытарам, як зараз гавораць. І гэта ў 14-15 год. Шчаслівы быў прыйсці за 15 кіламетраў дахаты на выходны ці ў канікулы, адпачыць, сагрэцца, паесці».*

5. ТУРКІ. Закапаныя рукапісы

Наступная мясціна, якую мы наведаем, — маленькі гарадок у Закарпацці. Менавіта тут апынуўся намеснік палітрука, баец 298-га горнаартылерыйскага палка 192-й горнастралковай дывізіі Паўднёва-Заходняга фронту Іван Мележ у 1941 годзе. Прызвалі яшчэ студэнтам першага курса ўніверсітэта. Давялося ўжо вызваляць Паўночную Букавіну.

Іван Мележ, хоць гэта было забаронена, вёў дзённік. Раніцай 22 чэрвеня 1941 года запісвае: *«У 7 гадзін лагер паднялі па трывозе... У канюшні раздавалі процівагазы, патроны. З парку гарматы спешна перацягнулі да ракі... Каля 9 гадзін. Над канюшняй праляцеў нямецкі бамбардзіроўшчык, абстраляў нас. А мы, стоўпіўшыся, глядзелі на яго і не верылі. Над паркам ён развярнуўся і кінуў бомбы, пасля бамбіў горад...»*

Вось тады Іван Мележ, як сцвярджае паэт Мікола Мятліцкі, закопвае ў падлеску каля граніцы скрутак з даваенным сваім скарбам — запіснымі кніжкамі, канспектамі, вершамі ў спадзяванні, што адступленне будзе нядоўгім, што ён неўзабаве вернецца назад. *«Тое надарыцца толькі праз пятнаццаць расстайных год. Але ўжо гаёк не ацалее, памянёны скарб застанецца не адшуканым».*

Дарэчы, усю вайну Мележ працягне весці дзённік, старонкі якога сёння можна прачытаць.

6. РАСТОЎ. Адратаваная рука

20 чэрвеня 1942 года пад Растовам будучаму класіку асколак авіябомбы раздрабіў правае плячо. 3 ліпеня, ужо ў шпіталі ў Есентуках, Мележ запіша: *«Я ранены. Ранены цяжка, у плячо. Далёка ад фронту. Тады, калі, здавалася, быў зусім у бяспецы. Я ледзь не загінуў. У апошні момант я павярнуўся, і гэта мяне выратавала».*

5 ліпеня занатоўвае падрабязнасці: *«У Растове мне зрабілі аперацыю. Рабіў яе галоўны ўрач шпіталя Антонаў. Спачатку мне збіраліся ампутаваць руку, і я згадзіўся. У мяне было зусім разбіта плячо, і баяліся гангрэны. Але Антонаў забараніў рабіць ампутацыю. Ён сказаў, што рука спатрэбіцца, малады хлопец. Ён сам наглядаў за мной і сам зрабіў аперацыю».*

Рука трымалася на сухажыллях, з дапамогай марлевай павязкі. Ды яшчэ кантузія з наступным зніжэннем слыху і зроку...

У шпіталі ў Растове Мележу трапіўся ў рукі нумар часопіса «Новый мир», з заключнай часткай «Ціхага Дона». Гэты раман будзе ездзіць з ім у валізцы вельмі доўга. Раненне пад Растовам змяніла ўсё жыццё... Менавіта ў шпіталях Мележ пачаў пісаць апавяданні — левай рукой. *«24 жніўня. ...пішу. Апавяданне! Проста гару ад хваляванння. Нават руку тузае боль. Але я спыняюся толькі на хвіліну. І далей. Здаецца, будзе штосьці вельмі добрае! Ва ўсякім разе я гару, як у полымі.*

Як у ліхаманцы, галава, сэрца, увесь!
Што ж выйдзе з гэтага?»

І яшчэ адзін пазнейшы запіс: *«І так, хвала Богу, што жыву. Мае равеснікі ў зямлі даўно. Тыя, з кім я першыя дні вайны сустрэў... Мог і я даўно ў зямлі быць. Станіна мяне выратавала. Не захіснуўся б за яе — усё, не было б такога пісьменніка — Івана Мележа. Ды і доктару дзякуй, што руку правую не адняў. Колькі рука тая пяром павадзіла, колькі напісала! А ў дактароў ва ўсіх перакананне было — адняць руку трэба. І толькі адзін доктар не згадзіўся з усімі, не даў адняць руку. І ён перамог. Другі раз я і пра літаратараў*

Івана Мележа

пісьменнік мроіў палескімі балотамі

Іван Мележ каля школы ў Хойніках, дзе ён вучыўся.

так думаю: трэба камусьці не згаджацца з усімі, ісці насуперак. І здараецца, той якраз і перамагае, хто ідзе не так, як усе...»

7. БУГУРУСЛАН. Прыгажуня Лідзія і празаічны дэбют

Пасля шпіталяў Мележ, прызнаны нягодным да фронту, патрапіў у Бугуруслан, там было адкрыта Цэнтральнае даведачнае бюро па эвакуіраваных.

Уражанне ад Бугуруслана ўраджэнца палескага Глінішча ад 16 кастрычніка 1942 года:

«Першае жаданне хутчэй павярнуць назад, пакуль не адышоў цягнік. Ухапіцца на хаду за поручні і імчаць куды заўгодна, абы не заставацца тут. Стоячы ў дворыку станцыі, аглядаюся. На шэрым схіле гары — наводдаль — маленькія дамкі, таксама шэрыя, непаглядныя»

Не з'ехаў. Тут чакаў лёс.

Мележ патрапіў на кватэру да сям'і нянростай — да сям'і патомных інтэлігентаў. Дачка гаспадыні, дзевятнаццацігадовая Лідзія Пятрова, заўважыла і незвычайнасць кватаранта...

Мне пашчасціла ў свой час сустрэцца з Лідзіяй Якаўлеўнай. Вядома, першае пытанне было пра знаёмства з Мележам і першае ўражанне...

— Звычайны хлапец, — задумалася Лідзія Якаўлеўна, — з рукой на марлевай павязцы, у салдацкай гімнасцёрцы і шырокіх матроскіх штанах. У яго рэчмяшку было толькі тры тамы «Ціхага Дона». Заўважала толькі, што кватарант увесь час нешта пісаў у нататніку і на планшэце з картай сцяжкамі адзначаў перамяшчэнні войскаў пасля кожнага паведамлення па радыё «У апошнюю гадзіну».

Кватарант таксама зрабіў высновы: «Лідзія — дзяўчына асаблівая! Трэба да яе ўважліва прыгледзецца!»

Мележу быў 21 год. На той час некалькі вершаў на рускай мове надрукаваў у «Бугурусланской правде», але Лідзіі, добра начытанай, з высокімі патрабаваннямі, яны не спадабаліся, пра што і сказала. Мележ пасля напіша пра адну з гераінь, у якой вывеў жонку: «Яна заўсёды была шчырай, рэзкай, прамой, усё цяжкое выварочвала, змушала прама глядзець. З ёй было жудасна, балюча і разам з тым радасна. Гледзячы на яе, ён захапляўся: вось такім і яму трэба быць...»

Лідзія Якаўлеўна каментавала так: «Чэхаўская «Душачка» з мяне не атрымалася, але каханне дапамагала пераадольваць выццёвыя цяжкасці на працягу ўсіх 33 гадоў сумеснага жыцця».

Яны распісалася там жа, у Бугуруслане, нікому не сказаўшы. Ніякага вяселля не было. Блукалі па горадзе, стаялі на месце цераз раку Кінель, сядзелі на беразе і глядзелі, як плывуць ільдзіны.

Былі вельмі шчаслівыя.

Першая празаічная публікацыя Івана Мележа таксама адбылася ў «Бугурусланской правде» — гэта было апавяданне «Апошняя аперацыя».

8. СХОДНЯ. Бульба ў мундзіры, немаўля і навука

Калі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аднавіў работу на станцыі Сходня пад Масквой, Мележ вырашыў — абавязкова мусіць ехаць, давучвацца! Хоць у Бугуруслане прыстроіўся ў эвакуіраваны туды Малдаўскі педінстытут. Лідзія была хворая і цяжарная... Але туга па радзіме, па родным слове была неадольная, Мележ прыехаў у Сходню і быў залічаны адразу на трэці курс, да таго ж пачаў выкладаць ваенную падрыхтоўку. Калі прыехаў на зімовыя вакацыі ў Бугуруслан, дачцэ Людміле быў месяц.

Маладыя вырашылі, што мусяць уз'яднацца... Сабралі грошай... І Лідзія з маленькай дачкой, у лютым, адправілася ў Падмаскоўе. Дарога была жахлівая, да таго ж згубіўся багаж. Пасяліліся, у чым былі, на нечым лецішчы, дзе кватараваў Мележ. *«У нашым прахадным пакоі ўсе зручнасці былі — студэнцкі ложак і галандская печка, у якой мы гатавалі ежу ў старым, пагнутым салдацкім кацялку. Толькі тады я і бачыла часам Івана Паўлавіча, занятага хатняй працай. Гатаваць ён умеў дзве стравы: кашу і бульбу ў мундзіры».*

Затое там, сярод сваіх, Мележ акрыяў, актыўна пісаў, рабіў накіды да будучага рамана. А ў жніўні 1944 года «Сходня» вярнулася эшалонам з Масквы ў Мінск. Начальнікам эшалона быў студэнт 5-га курса Іван Мележ.

9. МІСХОР. Праца ў «прылазніку»

Першы ж раман — «Мінскі напрамак» — прынёс славу, жыццё стала куды больш дабрабытным. А вось здароўя не мелася... Івану Мележу неаднойчы даводзілася жыць у крымскіх санаторыях, пераважна ў санаторыі «Беларусь» у Місхоры. Алена Васілевіч успамінае, як у 1974-м разам з іншымі беларускімі пісьменнікамі з Ялцінскага дома творчасці выправіліся ў Місхор да Мележа, дзе ён адпачываў з жонкай.

«Мікола Аўрамчык, па праве блізкага сяброўства, спытаўся ў яго, ці працуе ён тут, ці піша.

— Пішу раман. У «прылазніку»... — Усмешка яшчэ больш выяўляла хваравітасць яго твару.

Ён жыў тады ўжо ў «люксе».

Лаўрэат Ленінскай прэміі. Дэпутат Вярхоўнага Савета. Народны пісьменнік... У яго было ўжо ўсё: поспех, агульнае прызнанне, забяспечанае становішча, слава... Усё было! Не было толькі здароўя.

«Жытло» сапраўды было люксавае.

Гасцёўню абстаўляў адмысловы гарнітур з мяккай зручнай мэблі. Тэлевізар. На ўсю падлогу дыван. І, здаецца, нават хрусталь у серванце... Запрашаючы нас садзіцца, ён гэтак жа насмешліва, як і аб «прылазніку», паскардзіўся:

— А пісьмовага стала няма...

Была ў тым шыкоўным «люксе» яшчэ шыкоўная спальня, а пісьмовага стала не было. Ён павёў, паказаў нам, дзе ён «піша раман». Сапраўды ў «прылазніку». У цесным маленечкім пакойчыку (без акна) перад ванным пакоем стаяў невялічкі столік. Нават не пісьмовы, а занесены сюды, у гэты люкс, з такога незвычайнага выпадку, можа, з каморкі кастэлянкі ці сястры-гаспадыні...»

Дарэчы, менавіта Мележ выканаў заданне Літфонду — знайсці ў Ялце дом, у якім памёр Максім Багдановіч, паглядзець, у якім ён стане, каб пасля ўзбудзіць хадайніцтва аб мемарыяльнай дошцы.

10. МІНСК. Шпацыры ў кампаніі зданяў

Першая мінская кватэра Мележа была на вуліцы Клары Цэткін. Потым пераехалі на Беларускую, цяперашнюю Ульянаўскую, у камуналку, дзе суседзямі былі ўдава Кузьмы Чорнага Рэвека Ізраілеўна і яе дачка Ірына. Потым сям'я перабралася на Карла Маркса, 36, затым на Інтэрнацыянальную ў вялікую чатырохпакаёвую кватэру. Апошняя кватэра Мележа — пяціпакаёвая, з асобным кабінетам і асобнай бібліятэкай, у доме па вуліцы Янкі Купалы, 7, насупраць парка Горкага.

Падчас размовы з Лідзіяй Якаўлеўнай я спытала, як Мележ ставіўся да горада — мы ж ведаем яго як песняра вёскі... Лідзія Якаўлеўна адказала, што ён любіў хадзіць па горадзе, заўсёды заўважаў прыгожыя будынкі, архітэктурныя дэталі, звяртаў на іх увагу спадарожнікаў.

А вось што расказваў Сяргей Грахоўскі: *«Мы часта сустракаліся ў парку імя Горкага. Аднойчы бачу — шнуруе задуменны Мележ па шырокай алеі. Я павітаўся і хацеў прайсці міма, каб не замінаць засяроджанаму чалавеку. А ён запыніў сам. «Чаму вы адны гуляеце, Іван Паўлавіч? У Купалаўскім скверы нашы хлопцы ходзяць». — «А я не адзін, — адказаў Мележ, — вунь са мною колькі людзей, і ўсё землякі — глінішчанскія і юравіцкія, хойніцкія і каранёўскія. Гаворым і спрачаемся, нават сварымся часам». Ён усміхнуўся і хітра падморгнуў. Мне здалося, што сапраўды вакол цэлы натоўп яго герояў».*

Што ж, можна ўявіць, што гэтыя героі і да сёння блукаюць па сцежках свайго стваральніка.

Адзін з апошніх запісаў Мележа: «Адламала галіну, на якой поўна зялёных яблык, я як гэтая галіна. Поўна ва мне задум, якія прападуць са мной».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Помнік героям Мележа ў Хойніках.

Класіка на экране

Палітра палескага жыцця і характараў

У эфіры тэлеканала «Беларусь 3» 8 лютага пакажуць экранізацыю першай часткі эпапеі «Палеская хроніка» — фільм «Людзі на балоце» па аднайменным рамане беларускага класіка Івана Мележа.

Кінастужку ў 1981 годзе зняў рэжысёр Віктар Тураў. Асноўная сюжэтная лінія ў фільме — гэта прыход савецкай улады ў вёску, што існуе сярод палескіх балот. І на фоне гэтага ўжо паўстаюць перад намі і раскрываюцца вобразы герояў Васіля Дзятліка, Ганны Чарнушкі, Яўхіма Глушака, іх сем'яў і аднавяскоўцаў... Вясковае жыццё з яго клопатамі і руцінай, а часам і з рамантыкай, размовамі пра надзённае і важнае — кожны з такіх эпізодаў дазваляе ўбачыць грані характараў, узаемаадносіны і пачуцці дзеючых асоб, паназіраць за іх жыццём і развіццём драматычных падзей... Сярод акцёраў, якія ўвасобілі герояў, можна ўбачыць Алену Барзову, Барыса Няўзорава, Юрыя Казючыца, Стэфанію Станюту, Генадзя Гарбука і многіх іншых. Хоць, напрыклад, у ролі Васіля мы маглі б убачыць Аляксандра Галібіна, але з-за таго што акцёр не змог сысціся ў поглядах з рэжысёрам, атрымалі мы іншага выканаўцу. А вось што да ролі Гарбука (ён у фільме іграе бацьку Ганны), то ў ранняй экранізацыі акцёр выконваў ролю Васіля. Актрысу ж на ролю Ганны шукалі сярод 22 прэтэндэнтак.

Першую экранізацыю рамана здзейснілі ў 1965 годзе рэжысёры Аляксандр Гутковіч і сцэнарыст Эдуард Герасімовіч. Яны зрабілі трохсерыйную тэлевізійную карціну «Людзі на балоце», якая была заснавана на асноўных сюжэтных лініях літаратурнага твора. Пасля была спроба экранізаваць раман у рэжысёра Уладзіміра Забелы ў 1979 годзе.

Што да кінаверсіі Віктара Турава, то яе рэжысёр ствараў, пачынаючы ад напісання сцэнарыя да будучай карціны. А жонка рэжысёра потым расказвала, як падчас работы над фільмам ён пазнаёміўся з доктарам-псіхіятрам, які прапанаваў зрабіць месцам творчасці палату ў адной сваёй клініцы. Там была поўная ізаляцыя, ніхто не перашкаджаў, што дазваляла цалкам паглыбіцца ў матэрыял. Вытворчасць кінастужкі ажыццяўлялася на кінастудыі «Беларусьфільм» Творчым аб'яднаннем мастацкіх фільмаў. З пошукам месца здымак давялося паездзіць — шукалі натуру і на Гомельшчыне, і на Віцебшчыне, разглядалі варыянт нават у Львове і Латвіі, але ў выніку часткова адзнялі ў Бешанковічах, а самі Курані — у Бярэзінскім запаведніку ў наваколлі Домжарыц. Таксама дзеля камфорту артыстаў, бо на момант, калі ў канцы кастрычніка выпаў снег, а некаторыя сцэны яшчэ не даздымалі, рэжысёр звярнуўся па дазвол выехаць у Ялту, каб давесці справу да заканчэння. Падчас гэтай творчай камандзіроўкі і знялі некалькі сцэн.

«Людзі на балоце» — фільм, які лічыцца хрэстаматыйнай экранізацыяй рамана класіка. Кінастужка мае і працяг пад назвай «Подых навальніцы», які з'явіўся ў 1982 годзе. Пасля рэжысёр зняў яшчэ тэлевізійны фільм «Апейка». Яго ў 1985 годзе аб'ядналі з першымі дзвюма кінастужкамі ў тэлевізійную эпапею «Людзі на балоце» працягласцю восем серый.

Не прапусціце фільм «Людзі на балоце» ў панядзелак на тэлеканале «Беларусь 3». Яго будуць трансліраваць як у ранішнім, так і ў вячэрнім эфіры. Пасля паказу кінастужкі гледачоў чакае фільм «Іван Мележ: перарваныя хронікі» з дакументальнага цыкла «Заметкі на палях».

Алена ДРАПКО.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договора аренды

Организатор электронных торгов: Пуховичский районный исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, тел.: (801713) 35427, 35166; 8 (033) 9029538.

Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»

Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: **9 марта 2021 года.**

Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права	Площадь земельного участка, *га*	Инженерная инфраструктура (возможность подключения)	Начальная цена, *руб.*	Задаток, *руб.*	Расходы по подготовке, *руб.*
1	Минская область, Пуховичский р-н, пос. Дружный (пересечение улиц Парковая и Чепика)	624485902101000355 строительство и обслуживание торгово-развлекательного центра; аренда на 25 лет (годовая арендная плата 719,00 руб.)	0,6704	Сети электроснабжения, водоснабжения, теплоснабжения, водоотведения	4085,25	408,53	2744,40 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП
2	Минская область, Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Житняя, У-11.7	624450100001003874 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность	0,0985	Сети водоснабжения	13455,10	1345,51	1879,30 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП
3	Минская область, Пуховичский р-н, садоводческое товарищество «Новая Надежда», участок № 39	624485700031000040 ведение коллективного садоводства; частная собственность	0,0799	Отсутствует	1422,22	142,22	1245,54 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП
4	Минская область, Пуховичский р-н, садоводческое товарищество «Энергетик-5», участок № 100	624485700008000274 ведение коллективного садоводства; частная собственность	0,0610	Сети электроснабжения	1604,30	160,43	1523,84 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **2 марта 2021 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.00–13.00, 14.00–17.00).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победить электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность, или на право заключения договора аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

При заключении на новый срок договоров аренды земельных участков, за право заключения которых была внесена плата (в том числе по результатам проведения электронных торгов), плата за право заключения договоров аренды этих земельных участков взимается арендодателем вновь.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о повторном открытом аукционе по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), расположенного по ул. Аульская 9 марта 2021 года

Вид аукциона	Открытый	
	Лот № 1	**Лот № 2**
Предмет аукциона	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-13597 общей площадью 970,0 кв. м. Назначение – здание административно-хозяйственное. Наименование – административное здание. Составные части и принадлежности: пристройка, водопроводная сеть, канализационная сеть. Двухэтажное кирпичное здание 1978 года постройки	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-13339 общей площадью 42 кв. м. Назначение – здание специализированное иного назначения. Наименование – котельная. Одноэтажное кирпичное здание 1995 года постройки
Кадастровый номер земельного участка и размеры	440100000003003910 площадью 0,2757 га	440100000003003909 площадью 0,0158 га
Имущественное право земельного участка	Право постоянного пользования	Право постоянного пользования
Место-расположение земельного участка	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Аульская, д. 36**	**Гродненская область, г. Гродно, ул. Аульская, д. 36А**
Продавец	Закрытое акционерное общество Банк ВТБ (Беларусь) г. Минск, ул. Московская, д. 14; тел.: 8 017 309 16 16 (6589), 309 15 15, 309 15 30; контактный номер лица для показа объекта 8 029 781 30 37	
Начальная цена продажи	**119 250,00 рубля** (с учетом НДС 20 %)	**2 325,00 рубля** (с учетом НДС 20 %)
Сумма задатка	11 925,0 рубля	232,5 рубля
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 8 0152 62 60 55, 62 60 56		
Дата проведения аукциона: **9 марта 2021 года**		
Время проведения аукциона: 12.00		
Место проведения аукциона: **г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, актовый зал**		
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет 407		
Дата и время начала приема документов: 8 февраля 2021 года 8.00		
Дата и время окончания приема документов: 2 марта 2021 года 17.00		

В соответствии с генеральным планом г. Гродно здание по ул. Аульская, 36А расположено на территории производственной зоны, а здание № 36 по ул. Аульская на территории смешанной производственно-деловой зоны в границах СЭЗ «ГродноИнвест». Объекты не имеют обременения.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», **юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

В случае наличия ходатайства от победителя аукциона или от единственного участника аукциона, давшего согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене аукциона, увеличенной на шаг аукциона, ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) может быть рассмотрен вопрос о предоставлении рассрочки оплаты в отношении недвижимого имущества на срок не более 24 месяцев.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в сроки и порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адреса сайтов: Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, организатора аукциона http://gcn.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Открытого акционерного общества «Школьник», г. Пинск

Лот № 1	
Название объекта	**Капитальное строение (административное здание)**
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Рокоссовского, 15
Продавец объекта	Открытое акционерное общество «Школьник», г. Пинск, г. Пинск, ул. Революционная, 3, тел.: 8 (044) 4713232, 8 (0165) 64-34-89, 8 (0165) 64-72-97
Сведения об объекте	Административное здание, инвентарный номер 130/С-1143. Назначение: здание административно-хозяйственное. Общая площадь – 149,4 м². Фундамент: бетон; наружные стены: блоки стеновые из ячеистого бетона, кирпич; внутренние стены: кирпич; перегородки: кирпич, блоки стеновые из ячеистого бетона; перекрытия: дерево, плита железобетонная; крыша: металлическая черепица; полы: линолеум, ламинированные панели, доска, плитка; окна: дерево; двери: дерево; наружная отделка стен: оштукатурено; внутренняя отделка стен: оштукатурено, оклейка обоями, облицовка керамической плиткой, обшивка гипсокартонными листами. Отопление: котел на твердом топливе; холодное водоснабжение: централизованная система; канализация: централизованная система; горячее водоснабжение: автономная система; электроснабжение: централизованная система; вентиляция с естественным побуждением. Имеются составные части: покрытие из тротуарной плитки площадью 44 м², ворота откатные шириной 10,00 п. м, забор металлический протяженностью 17,00 п. м
Информация о земельном участке	Площадь земельного участка – 0,0272 га. Предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания административно-хозяйственного (кадастровый номер 144500000013001198)
Условия продажи	Возможна рассрочка платежа до 1-го года с ежемесячной индексацией платежей со дня заключения договора купли-продажи с внесением первоначального платежа в размере не менее 30 % цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка и в срок, не превышающий 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи в соответствии с действующим законодательством
Начальная цена объекта, руб.	118812,00 рубля, в том числе НДС – 19802,00 рубля
Сумма задатка, руб.	23762,40 рубля
Шаг аукциона	15 % от предыдущей названной аукционистом цены продажи предмета аукциона
Расходы по подготовке технического паспорта, земельно-кадастровой документации, инвентаризации	86 рублей 40 копеек
Организатор аукциона	Открытое акционерное общество «Школьник», г. Пинск, ул. Революционная, 3, тел.: 8 (044) 4713232, 8 (0165) 64-34-89, 8 (0165) 64-72-97

Аукцион состоится 10 марта 2021 года в 15.00 в кабинете директора ОАО «Школьник», г. Пинск по адресу: г. Пинск, ул. Революционная, 3.

Для участия в аукционе организатору аукциона подается: заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет ОАО «Школьник», г. Пинск, р/счет: BY46 AKBB 3012 3840 0843 5120 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП: 200297549, ОКПО: 14809509, с отметкой банка, срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления с приложением необходимых документов с организатором аукциона заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме, предусматривающее условия о задатке и конкретный размер штрафа с недобросовестных участников аукциона, по вине которых он признается нерезультативным, либо его результаты аннулируются.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол в день аукциона, возместить расходы по подготовке технического паспорта, земельно-кадастровой документации, инвентаризации; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты – в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Школьник», г. Пинск, утвержденной директором «Школьник» г. Пинск 31.05.2019 года и согласованной протоколом наблюдательным советом ОАО «Школьник», г. Пинск от 31.05.2019 года № 20.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Революционная, 3, кабинет юрисконсульта, тел.: 8 (044) 4713232, 8 (0165)64-34-89, 8 (0165) 64-72-97 по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00 по 09 марта 2021 года включительно.

Информация о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, +375 (29) 5100763, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Продавец: учреждение образования «Белорусская государственная академия связи», 220076, г. Минск, ул. Франциска Скорины, 8/2, тел. +375 17 356 96 06.

Лот № 1. Право заключения договора аренды сроком на 5 лет части капитального строения: помещений общей площадью 258,0 кв. м (помещения на 1-м этаже: 36,6; 99,2; 24,7; 14,1; 7,8; 14,5; 11,1; 3,5; 15,1; помещения в подвальном этаже: 11,2; 1,9; 3,9; 2,4; 6,1; 1,9; 1,4; 2,6) кв. м, расположенных в капитальном строении с инв. № 200/С-903 (наименование – здание многоквартирного жилого дома) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ильинского, 43. Целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,0. **Нач. цена:** 1090,05 бел. руб. **Дата, время и место проведения аукциона: 09.03.2021 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в КУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано 04.02.2021 на сайтах Государственного комитета по имуществу http://www.gki.gov.by/, https://au.nca.by/ (№ 4629), Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/.

Дапамога

ВАЖНЫЯ СПРАВЫ ЧЫРВОНАЙ «ГАЗЕЛІ»,

або Чым займаецца сацыяльны патруль

У свеце 150 мільёнаў людзей без даху над галавой — гэта два працэнты насельніцтва планеты. Яшчэ 1,6 мільярда людзей — 20 працэнтаў папуляцыі Зямлі — пазбаўлены прыдатнага для жыцця дома. Паводле звестак арганізацыі ESRI, горад з найбольшай колькасцю бяздомных — Маніла на Філіпінах, другі — Нью-Ёрк. У кожнай краіне свету шукаюць спосабы дапамагчы гэтым людзям сацыялізавацца. Але ў той жа час існуе праблема іх непрымання. Так, напрыклад, у Венгрыі ёсць закон, які забараняе бяздомнасць. Чалавека адпраўляюць у прытулак прымусова, а калі ён адмаўляецца, то яму могуць прысудзіць папраўчыя работы. У Сан-Францыска мясцовыя жыхары ставяць на бардзюры валуны, каб бяздомныя не змаглі размясціць там свае палаткі. У нашай краіне грамадзяне выклікаюць міліцыю, калі бачаць у сваім ў пад'ездзе бяздомнага. Іх лічаць алкаголікамі, наркаманамі, «нячыстымі на руку», пераносчыкамі розных захворванняў. Нярэдка яно так і ёсць, але як правіла — гэта вынік бяздомнасці. Людзі паступова страчваюць сваё чалавечае аблічча. У гэтым я пераканалася сама падчас акцыі «Сацыяльны патруль», якая праходзіць зараз у Мінску.

Мэтай акцыі з'яўляецца выяўленне асоб без пэўнага месца жыхарства, аказанне ім сацыяльнай, медыцынскай, гуманітарнай дапамогі, ажыццяўленне мерапрыемстваў, накіраваных на іх сацыялізацыю і інтэграцыю ў працоўную дзейнасць.

У рамках акцыі, якая прадоўжыцца да 28 лютага, прадугледжаны рэйды па месцах знаходжання асоб без пэўнага месца жыхарства — там іх звычайна кормяць гарачым, выдаюць цёплую вопратку, аказваюць медыцынскую, юрыдычную, і нават псіхалагічную дапамогу. Пры неабходнасці дапамагаюць знайсці начлег, спрыяюць уладкаванню сувязяў з роднымі і вырашэнню іншых пытанняў.

У склад групы «Сацыяльнага патруля» ўваходзяць супрацоўнікі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, упраўленняў унутраных спраў, медработнікі, валанцёры, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Да адной такой групы ў Маскоўскім раёне я і далучылася. Збіраліся мы ў ТЦСАН Маскоўскага раёна а 9-й гадзіне раніцы. Загадзя валанцёры ADRA International забяспечылі групу сацыяльнага патруля прадуктамі і вопраткай для бяздомных. Спецыялісты ТЦСАН пакла-

паціліся і прыгатавалі для іх гарачы абед. Медсястра з міліцыяй ужо былі на месцы. Заставалася толькі забраць прадуктовыя наборы для падапечных ад Чырвонага Крыжа.

«Акцыя «Сацыяльны патруль» — выдатная ідэя, — упэўнена спецыяліст па сацыяльнай рабоце ТЦСАН Маскоўскага раёна Валянціна Сілівончык.— Але нам было б значна цяжэй працаваць, калі б не дапамога нашых валанцёраў. Мы працуем з бяздомнымі на працягу ўсяго года. Калі даведваемся пра такога чалавека, то выязджаем да яго, каб высветліць, як так здарылася, што ён аказаўся на вуліцы. Калі трэба, дапамагаем зрабіць дакументы, расказваем аб месцах, дзе можна пераначаваць, некаторым выклікаем хуткую, бо, бывае, чалавек ужо занадта хворы, але не звяртаецца па дапамогу. Вось нядаўна мы знайшлі пажылога чалавека. Мужчына не разумеў, як трапіў у Мінск, толькі гаварыў, што яму вельмі дрэнна. Мы яго пакармілі, выклікалі хуткую. Аказалася, у яго была двухбаковая пнеўманія. Мог памерці ў любы момант».

Садзімся ў старую чырвоную «газель» і выязджаем па прадуктовыя наборы. Даволі хутка справіліся з пагрузкай каробак у машыну і адправіліся ў дарогу.

«Зараз паедзем да Фёдара Міхайлавіча, — гаворыць Валянціна Сілівончык. — Мы яго ўжо ведаем. Робім яму пашпарт і вядзём перамовы з яго роднымі. Яны не хочуць пускаць яго дадому, і таму ён жыве ў пад'ездзе на лесвіцы. Яго родныя сцвярджаюць, што ён заразіў дзяцей нядобрай хваробай, таму тыя яго і выгналі. Жыве сям'я — некалькі пакаленняў — у адной кватэры, ім цесна...» Нашу размову перарывае тэлефонны званок. Аказалася, Фёдара Міхайлавіча ноччу забрала хуткая.

У міліцыі таксама сігналаў пра бяздомных няма. Вырашаем наведаць найбліжэйшыя прыёмана-рыхтоўчыя пункты «Белдругрэсурсаў». Прыязджаем у пункт на вуліцы Уманскай. Прыёмшчык пункта расказвае, што зараз у іх нікога няма, праўда, непадалёку ў прыватным сектары каля закінутай хаты жыве адзін бяздомны. Накіроўваемся туды. Ведаем, што завуць чалавека Слава. Бачым побач з закінутым домам нешта падобнае на хлеў. Толькі замест дзвярэй вісяць старыя рваныя пакрывала і коўдра. За імі... на зямлі ляжанка з анучы, зверху капае, і праз гэта проста сярод «памяшкання» вялікая лужына. Каля выхаду раскіданы хлеб... Але нікога няма... Зноў садзімся ў «газель». Наведаўшы безвынікова яшчэ некалькі пунктаў, нарэшце сустракаем Ягора — памочніка прыёмшчыка. Тлумачым прычыну нашага прыезду.

— Такім чынам вы нікога не знойдзеце, — упэўнена гаворыць мужчына. — Бяздомныя — народ творчы, далікатны... Ніхто так да вас не выйдзе! Тым больш у іх распарадак дня трошкі іншы. Яны да нас прыходзяць каля васьмі-дзевяці гадзін раніцы. Здаюць усё, што назбіралі, а потым... Потым у іх сіеста!

Прымаем рашэнне не выпускаць міліцыянераў з машыны без патрэбы. Ізноў па падказцы едзем у месца, што недалёка ад лесапарку Мядзвежына. Гавораць, там ёсць палатачны лагер бяздомных. Але і там нікога не знаходзім. У выніку прымаем рашэнне ехаць на вакзал.

У машыне стыне гарачы абед і адзінока стаяць каробкі з адзеннем... У Лондане такой праблемы б не ўзнікла — там ёсць спецыяльныя кіёскі з харчаваннем для бяздомных, і туды прыходзяць яны самі, калі маюць патрэбу. Дарэчы, у Шатландыі жыхары гарадоў зімой развешваюць цёплыя куртки на ліхтарных слупах для бяздомных, а ў Гамбургу на дрэвах вешаюць самаробныя шалікі...

У Мінску ёсць дом начнога знаходжання для бяздомных. Там жывуць людзі без мінскай рэгістрацыі, з васьмі раніцы да пяці вечара яны знаходзяцца на рабоце, потым могуць прыйсці паесці і пераначаваць. Але ёсць умова: чалавек павінен хоць бы чым-небудзь займацца. Толькі зусім старых працаваць не прымушаюць.

«Мы можам дапамагчы толькі тым людзям, якія самі на гэта згодныя, калі яны адкрыта ідуць на дыялог і гавораць з намі, — тлумачыць Валянціна. — Бывае так, што чалавек хворы і яму трэба ехаць у бальніцу, але ён адмаўляецца. Тут мы зрабіць нічога не можам. Калі нехта жадае, дапамагаем яму ўладкавацца ў дом начнога знаходжання ці ў Свята-Елісавецінскі манастыр, дзе таксама дапамогуць сацыялізавацца. Калі ж ёсць інваліднасць, то прапануем аформіць у інтэрнат... У прынцыпе мы гэтую работу робім круглы год. Проста зімой падчас акцыі мы патрулюем вуліцы і шукаем такіх людзей, даём ім вопратку, кормім гарачым...»

Нарэшце, прыязджаем на вакзал. Выходзім і накіроўваемся да залы чакання. Пытаемся ў работніка, ці ёсць у іх нашы кліенты. Аказалася, поўна! Нас вядуць у саму залу, дзе, прытуліўшыся адзін да аднаго, сядзяць бяздомныя. Яны амаль спяць на сваіх брудных сумках і поліэтыленавых пакетах.

— Хлопцы, вы галодныя? — пытаюся я гучна ў іх. — Мы вам скрынкі з ежай прывезлі і адзенне.

Яны заварушыліся, адзін, расплюшчыўшы вочы, недаверліва спытаў:

— А ад якой арганізацыі?

Растлумачыўшы ім, хто мы такія, накіраваліся да выхаду. Гэта было яшчэ тое відовішча: за дзвюма жанчынамі і фатографам гужам ішлі чалавек шэсць бяздомных. Наша калона расцягнулася на метраў дзесяць. Васіль сходу стаў расказваць сваю гісторыю.

«У мяне і жыллё ёсць, і прапіска... Кватэра дасталася мне ад бацькоў, у ёй прапісаны брат, сын ды я. І жонка там мая жыве, але яна не прапісана. Мы з ёй увесь час сварымся, яна крычыць і крычыць, шкодная такая! Часта выклікае міліцыю, хоча, каб мяне пасадзілі. А за што? Мне ўжо 63 гады! Я кажу: купіце мне хоць якую хатку ў вёсцы, і я паеду ад вас. Але ж грошай на гэта няма. Вось зараз разбяруся з дакументамі, і ўсё ў мяне наладзіцца. Прыду дадому і скажу, каб куплялі ў мяне пакой, так проста я ад іх не адстану...»

Сярод гэтых людзей быў і даволі малады, гадоў трыццаці, мужчына Валера. У яго, як мне падалося, не засталося ў роце ніводнага зуба. Ён сірата, скончыў школу-інтэрнат для дзяцей-сірот № 7. Патрапіў у турму, калі яму было шаснаццаць.

«Калі я выйшаў, то падаў дакументы ў суд, каб мне мой метраж аддалі. За сіротамі звычайна замацоўваюць жыллё, — тлумачыць Валера. — Але суд прысудзіў метры на карысць мачахі. А мне куды ісці? Выбар невялікі: турма альбо вуліца...»

Самым пажылым з мужчын аказаўся Віктар Васілевіч, якому 67 гадоў. Яго сужыцелька памерла, і яе дачка выселіла пажылога мужчыну з кватэры.

«Яна ж наследніца, а я хто? — разгублена гаворыць мужчына. — Так вось і стаў «бамжом». А некалі ўсё было... Працаваў на Мінскім заводзе шасцерняў, выйшаў на пенсію, думаў, што раней памру, чым мая сужыцелька, але вось як яно выйшла. А пашпарт у мяне ёсць, і пенсія 120 рублёў. Маленькая такая, таму што я бежанец. Прыехаў сюды разам з жонкай-беларускай, калі СССР разваліўся. Тут у нас не заладзілася, і мы разышліся. А хату ж набывалі на імя былой жонкі, бо правоў у мяне як у бежанца не было. Вось так і застаўся без нічога».

Людзі расказвалі свае гісторыі спакойна. Яны ўжо прывыклі, што для таго каб атрымаць дапамогу, трэба расказаць пра сябе і ў чым маеш патрэбу. У некаторых мужчын былі памарожаныя рукі, і яны не маглі несці каробкі з прадуктамі. Некаторыя кульгалі, але ўсе адмовіліся ад медыцынскай дапамогі. У хуткім часе да нашай чырвонай «газелі» з усіх бакоў вакзала пацягнуліся людзі. Некаторыя бралі толькі цёплую вопратку, некаторыя абутак, іншыя — прадукты. Амаль усё было раздадзена, але многім не хапіла, і група «Сацыяльнага патруля» паабяцала, што прыедуць да іх на наступны дзень. Калі селі ў машыну, міліцыя паведаміла, што каля метро «Міхалова» грэецца наш «кліент». Сапраўды, там стаяў мужчына, калі мы прыехалі туды. Ён амаль нічога сказаць не мог і хацеў хутка сысці. Але нам удалося ўручыць яму прадуктовы набор.

— Трэба ехаць у цэнтр, — занепакоена сказала Валянціна. — У нас скончыліся прадукты, а раптам хтосьці зноў аб'явіцца...

І «Сацыяльны патруль» паехаў на чырвонай «газелі» далей — рабіць свае важныя справы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

ЗАКАДЗІРАВАНАЯ ЭСТЭТЫКА

Якая розніца паміж традыцыйным і нацыянальным касцюмам?

Што складала аснову гардэроба нашых далёкіх продкаў? Якія колеры часцей за ўсё выкарыстоўваліся для вышыўкі на адзенні і ў якой тэхніцы яна выконвалася? Пра што трэба памятаць сёння дызайнерам, каб ствараць сучасныя мадэлі, якія разам з тым нясуць магутны этнічны пасыл?

Пра гэта гутарым са старшым навуковым супрацоўнікам аддзела старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдатам мастацтвазнаўства Марыяй ВІННІКАВАЙ.

— Марыя Мікалаеўна, чаму спецыялісты лічаць, што словам «вышыванка», якое трывала замацавалася ў лексіконе беларусаў, няправільна вызначаць адзенне з нацыянальным каларытам?

— У народнай беларускай культуры традыцыйнае адзенне ніколі не называлі «вышыванкай». Гэтае слова ідэнтычнае такім вызначэнням, як «маляванка», «пісанка» і, верагодна, запазычана з украінскай мовы. Калі яго ўжываюць, нярэдка маюць на ўвазе адзенне з вышыўкай «крыжыкам». Але гэтая тэхніка з'явілася ў нас толькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Датуль ў нацыянальным строі вышыўка калі і прысутнічала, то зусім іншая. Напрыклад, у Кобрынскім раёне мясцовая жыхарка паказвала мне старыя сарочкі, якія захаваліся ад яе бабулі, і называла іх «нацягаными», гэта значыць вышытыя «нацягам» — швом «наперад іголку» па ліку нітак палатна, які ўтварае палосы геаметрычнага арнаменту. На мой погляд, у дачыненні да сучаснасці правільна казаць пра касцюм з нацыянальным каларытам. Таму што паміж традыцыйным і нацыянальным касцюмам ёсць пэўная розніца. Традыцыйны — гэта сельскі касцюм, які адказвае ўмовам жыцця на дадзенай тэрыторыі: яго стварылі, развілі карэнныя жыхары, ён адпавядае нашым прыродна-геаграфічным умовам. А «нацыянальны» — больш шырокае паняцце, яно адносіцца да адзення розных слаёў насельніцтва. Заможныя грамадзяне замаўлялі прадметы гардэроба з-за мяжы або шылі іх па агульнапрынятых еўрапейскіх узорах, таму іх касцюм больш зазнаў уплыў моды.

— Як вызначыць, якое адзенне адпавядае народнай традыцыі, а якое — не?

— Перш за ўсё — па кампазіцыйным вырашэнні. Вышыўка ў беларусаў служыла абярэгам і размяшчалася ў месцах, якія адкрывалі доступ да цела: па каўняры, абшэўках, па нізе спадніц. У жанчын дзетароднага ўзросту багатым быў арнамент на рукавах сарочкі і фартуху: лічылася, што ён абараняў іх ад сурокаў.

— Якімі былі галоўныя элементы беларускага традыцыйнага касцюма?

— Асноўны кампанент жаночага, мужчынскага, дзіцячага касцюма — гэта сарочка, якая абавязкова павінна была закрываць шыю, локці і калені. Яна была прамой, без вытачак, свабоднай; падганялася па постаці за кошт зборкі па каўняры, нізе рукавоў і падпярэзвання па таліі. У гардэроб беларускіх сялянак уваходзілі таксама спадніцы, фартухі, галаўныя ўборы, камізэлькі. Улетку жанчыны насілі простую спадніцу з лёну, зімой — са шчыльнай (часам у палоску, клетку) ваўнянай тканіны, якая называлася андарак. У Маларыцкім раёне распаўсюджаны быў аналаг андарака — бурка, якая адрознівалася багатым тканым ромбагеаметрычным арнаментам.

Увесну і ўвосень паверх кашулі жанчыны апраналі світу (світку) — доўгую расхінную суконную вопратку, якую падпярэзвалі тканым або плеценым поясам. Абавязковым атрыбутам жаночага касцюма лічыўся фартух. Яго насілі не толькі ў будні, але і на святы. Прычым не для таго, каб не запэцкаць спадніцу, а перш за ўсё як абярэг для жаночага ўлоння. Выходзіць на людзі без фартуха лічылася непрыстойным. На поўдні Беларусі ў некаторых рэгіёнах спадніц не надзявалі наогул, а павязвалі два фартухі — спераду і ззаду. У Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці дзяўчынкі насілі калышку — фартушок, які павязвалі ззаду на кашулю. Ва ўсходніх раёнах Беларусі распаўсюджана была такая парадная паясная адзежына, як панёва, якая складалася з двух кавалкаў ваўнянай саматканкі, сшытых толькі да сярэдзіны. Панёва драпіравалася вакол таліі і сцёгнаў і мацавалася шырокім плеценым поясам.

— Замужнія жанчыны ў традыцыйнай культуры абавязкова павінны былі насіць галаўны ўбор?

— Так. Уступіўшы ў шлюб, жанчыны заўсёды хавалі валасы пад намёткай або хусткай, пад якімі абавязкова быў чапец. Намётка была характэрная для ўсіх рэгіёнаў Беларусі, але ў кожным склаліся свае асаблівасці яе завівання на галаве. Дзяўчаты маглі хадзіць з непакрытай галавой, або насіць арнаментаваныя на канцах палатняныя галаўныя павязкі-«скіндачкі», ці абцягнуты каляровай тканінай абруч — «чылку» і іншае. У вёсцы Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці існаваў дзявочы галаўны ўбор «кубак». Асновай для яго служыла паласа лубу (або кардону) шырынёй 12-15 см, на якую нацягваліся рознакаляровыя стужкі. Гэты галаўны ўбор надзявалі ў тых выпадках, калі дзяўчына хацела паказаць, што гатовая выйсці замуж.

— А што ўваходзіла ў мужчынскі традыцыйны гардэроб?

— Акрамя сарочкі (кашулі), у мужчынскі традыцыйны сялянскі касцюм уваходзілі штаны, часам камізэлька з даматканага сукна або палатна. Абавязковым кампанентам быў пояс. Ён меў практычнае значэнне (кашуля прылягала да цела і не замінала працаваць), разам з тым быў яркім дэкаратыўным акцэнтам і лічыўся моцным абярэгам. Халасцякі завязвалі яго з левага боку, а жанатыя — пасярэдзіне, прычым вузлу аддавалася асаблівая ўвага — лічылася, што ён надае моц і абараняе ад сурокаў.

Без пояса нельга было выйсці за парог сваёй хаты. Світку (цёплую вопратку з валянага сукна) мужчыны насілі на працягу стагоддзяў, як і кажухі, пашытыя з аўчыны. Узімку галаву ад холаду абараняла шапка-вушанка з аўчыны або заячага, лісінага футра, пакрытая зверху цёмным сукном. Галаўныя мужчынскія ўборы — магеркі — валялі з воўны. Улетку насілі шапкі капелюшы з саломы: у некаторых рэгіёнах яны называліся брылі.

— Якія колеры былі найбольш папулярныя ў традыцыйным беларускім адзенні?

— Паколькі адзенне выраблялася, як правіла, з лёну або шэрсці, то пераважалі белы, шэры, карычневы, чорны колеры. Узоры ткалі і вышывалі ў асноўным чырвонымі ніткамі. У мужчынскім касцюме пояс быў заўсёды чырвонага колеру, а ў спадніцах па прыполе часта праходзіў дадатковы чырвоны кант.

Святочныя летнія ўборы сялянак. Пачатак XX стагоддзя. Тэрыторыя Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Сучасная льняная сукенка з вышыўкай. РУП «Скарбніца», Мінск.

Колер вышыўкі быў самым разнастайным. Ён залежаў ад таго, якія фарбавальныя матэрыялы былі даступныя ў той ці іншай мясцовасці. Найбольш распаўсюджаны быў чырвоны колер, які атрымлівалі з марэны. Часта ўжывалі і сіні колер, які атрымлівалі з расліны сіней. Вышывалі таксама чорнымі, карычневымі, зялёнымі ніткамі. Вышыўка ў беларусаў была пераважна геаметрычная. Найбольш распаўсюджаны ромб, крыж, квадрат, ромбападобныя фігуры, зігзагападобныя лініі, ромбы, вертыкальныя і гарызантальныя паласы. Часта ўжывалі выявы птушак, дрэў, кветак, але яны ніколі не былі рэалістычнымі. Вышыўка ў беларусаў заўсёды мела сімвалічны сэнс. Ромб — гэта сімвал Сонца, крыж — сімвал Сусвету, птушка — сімвал душы, дрэва — сімвал жыцця, кветка — сімвал прыгажосці. Круг — гэта абярэг. Чырвоны — колер свята, сонца. Часам у вышыўцы выкарыстоўваўся і сіні колер, які ўвасабляў сум, смутак. У Брэсцкім раёне ўжывалі і чорныя ніткі для арнаменту. Святочны ўбор паўсюдна ўпрыгожваўся больш багата, чым штодзённы.

— Пра што павінны памятаць сёння дызайнеры, каб правільна актуалізаваць нацыянальныя матывы ў адзенні? Што можа стаць, на ваш погляд, брэндам у гардэробе сучаснага беларуса?

— Сучаснае адзенне можа мець ярка выражаны нацыянальны стыль, здольны перадаць вобраз народа. Важна, каб яно стваралася з веданнем традыцый. Гэта не выключае наватарскіх дызайнерскіх пошукаў. Прадметам натхнення для сучасных мадэльераў, якія працуюць у этнастылі, могуць стаць як характэрныя матывы традыцыйнага беларускага арнаменту, так і агульнае сілуэтнае і каларыстычнае вырашэнне касцюма, спалучэнне тканіны прамысловага і ручнога вырабу з іх асаблівай фактурай і дэкорам, асаблівасці народнага крою і ручнога пашыву (напрыклад, выкарыстанне фігурнай зборкі, дэкаратыўных злучальных швоў і іншае). Сучасны модны вобраз у этнастылі можа быць таксама створаны праз увядзенне ў касцюмны комплекс асобных аксесуараў, выкананых у традыцыйных тэхніках ручнога ткацтва і вышыўкі. На мой погляд, нашым брэндам можа стаць лён. Невыпадкова яго называлі «божая свечка». Ён асацыяваўся з божым святлом, ласкай. Сяляне самі яго вырошчвалі, апрацоўвалі, пралі, ткалі ды шылі з яго адзенне, упрыгожвалі арнаментам. Лён экалагічны, не выклікае алергію, ён грэе ўзімку, у ім не горача летам. Але да яго патрэбен адмысловы падыход: лён вымагае простыя лініі крою. Рэчы з яго павінны быць зручныя і рацыянальныя.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ,
фота дадзены суразмоўніцай.

«МАСТАЦТВА КНІГІ»:

Нацыянальны конкурс праходзіць у 60-ы (!) раз

Міністэрства інфармацыі нашай краіны многія дзесяцігоддзі падтрымлівае і развівае такі ўражальны творчы праект, як нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі». Сёлета ён праходзіць у 60-ы раз! Вынікі будуць агучаны на традыцыйнай Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы. У гэтым годзе яна адбудзецца з 18 па 21 лютага.

Удзел у конкурсе, галоўнай мэтай якога з'яўляецца вызначэнне найлепшых выдавецкіх праектаў, што сталі падзеяй у нацыянальным кнігавыдавецтве, узялі 30 беларускіх выдавецтваў рознай формы ўласнасці. Было пададзена 214 выданняў. На папярэднім этапе для разгляду журы адабралі 95 кніг 16 выдавецтваў. Варта заўважыць, што найбольш выразна высокі ўзровень мастацкай і паліграфічнай культуры характарызуе прадукцыю дзяржаўных выдавецтваў. Іх асветніцкая, кніжная місія ў многім звязана і з выпускам сацыяльна значнай літаратуры, тых кніг, якія выконваюць у грамадстве асаблівую выхаваўчую ролю. І дзяржвыдавецтвы імкнуцца падыходзіць да рэалізацыі такіх праектаў творча.

На конкурсе «засвяцілася» шмат літаратуры, якая расказвае пра міжнародныя адносіны Беларусі, пра судакрананне беларускай культуры з усім светам.

— Надзвычай шмат цікавых з мастацкага, дызайнерскага пункту гледжання кніг, адрасаваных дзецям рознага ўзросту, — расказвае **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзімір АНДРЫЕВІЧ.** — Нават па намінацыі «Разам з кнігай мы расцём» журы было досыць цяжка прыняць рашэнне.

— Дарэчы, а ў якіх намінацыях разглядаліся выданні на конкурсе «Мастацтва кнігі»?

— «Мая Беларусь», «ЛІТ-фармат», «Падручнік новага стагоддзя», «Фотапогляд», «Залатыя скрыжалі», «АРТ-кніга», «Навука і веды», «Духоўнасць». Гэта што да тэматычных намінацый. А ёсць яшчэ спецыяльныя намінацыі — «За ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны», «Сцяжынкамі роднага краю», «Садружнасць», «У люстэрку часу», «Беларусь памятае». Паверце, працаваць у журы, старшынёй якога з'яўляецца **рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў, доктар мастацтвазнаўства, вядомы даследчык беларускай кніжнай графікі Міхаіл БАРАЗНА,** было надзвычай складана. Але беларуская кніга вартая гэтага!..

А пра пераможцаў, пра тое, хто будзе ўганараваны Гран-пры конкурса ў намінацыі «Трыумф», мы даведаемся на XXVIII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая будзе працаваць з 18 да 21 лютага.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

БІТВА ЗА САХАРУ

Чаму ў Афрыцы можа ўспыхнуць яшчэ адна вайна?

Прызнанне Вашынгтонам суверэнітэту Марока над Заходняй Сахарай можа быць адменена падчас прэзідэнцтва ў ЗША Джо Байдэна. Надзею на гэта выказалі ўлады Сахарскай Арабскай Дэмакратычнай Рэспублікі, паведаміла Sahara Press Service. Прадстаўнік фронту POLISARIO ў Францыі Мухамед Сідаці завіў: «Спадчына [45-га прэзідэнта ЗША] Дональда Трампа — цяжкая, але мы не трацім надзеі, паколькі новая адміністрацыя Байдэна выказала гатоўнасць перагледзець усё, што было зроблена яго папярэднікам». Пакуль жа мясцовыя жыхары кожны дзень рызыкуюць апынуцца пасярод жорсткіх баявых дзеянняў. Чаму ў Афрыцы можа ўспыхнуць яшчэ адна вайна?

ПЕРАМІР'Е СКОНЧЫЛАСЯ

Тэрыторыя сучаснай Заходняй Сахары доўгі час належала Іспаніі. У 1975 годзе Мадрыд адмовіўся ад гэтай тэрыторыі і падзяліў яе паміж Марока і Маўрытаніяй — насуперак рэзалюцыі ААН аб праве былых калоній на самавызначэнне. Тады таксама ўмяшаліся ЗША: яны спалохаліся, што ўлада дастанецца Народнаму фронту за вызваленне Сегіет-эль-Хамра і Рыа-дэ-Ора (POLISARIO), які актыўна змагаўся за незалежнасць Заходняй Сахары, згадала lenta.ru.

У адказ паўстанцы абвясцілі на спрэчнай тэрыторыі Сахарскую Арабскую Дэмакратычную Рэспубліку (САДР) і пачалі вайну супраць Марока з Маўрытаніяй. Тады іх падтрымалі Алжыр, Куба і Лівія. Маўрытанія ў выніку ад сваіх прэтэнзій на землі адмовілася, а Марока працягнула барацьбу — зноў-такі не без дапамогі ЗША, а таксама Францыі. Шматгадовая вайна для POLISARIO не скончылася нічым: у 1991-м ім давялося дамовіцца аб спыненні агню. Марока дасталося 80 працэнтаў тэрыторыі Заходняй Сахары, тыя, што засталіся (20 працэнтаў), адышлі паўстанцам. Вялікая частка гэтых тэрыторый — пустыня.

Варта адзначыць, што цяпер САДР — часткова прызнаная дзяржава. Незалежнай яе лічаць 84 члены ААН. Рэспубліка з'яўляецца членам Афрыканскага саюза, а яе прэзідэнт — генеральны сакратар POLISARIO. З 2016 года гэта Брагім Галі.

У канцы мінулага года тут пачаліся заўважныя ўзрушэнні. 14 лістапада POLISARIO абвясціў, што 29-гадовае перамір'е з Марока скончылася. Лідар САДР заявіў, што арганізацыя больш не будзе выконваць умовы дагавора. Хутчэй за ўсё, прычынай стала назапашанае напружанне з-за пратэстаў мясцовага насельніцтва, бясконцых тупіковых перагавораў з Марока і неадназначных дзеянняў з яго боку. Каралеўства, напрыклад, не раз запускала дроны над Заходняй Сахарай дзеля «барацьбы з экстрэмістамі».

Між тым сітуацыя працягвала абвастрацца. ЗША вырашылі аб'явіць аб суверэнітэце Рабата над спрэчнай тэрыторыяй менш чым праз месяц — 10 снежня 2020-га. У прэс-рэлізе Белага дома растлумачылі, што незалежнасць Заходняй Сахары ў любым выпадку нерэалістычная. Афіцыйны Вашынгтон заўважыў, што вырашыць канфлікт можна толькі з дапамогай «сапраўднай аўтаноміі ў рамках суверэнітэту Марока». Так адміністрацыя Трампа імгненна распарадзілася лёсам 600 тысяч жыхароў рэгіёна — «кавалачкам» зямлі памерам з Вялікабрытанію.

ПРЫНАДА ДЛЯ ІНВЕСТАРАЎ

Палітыка ЗША ў дачыненні да Заходняй Сахары з прыходам да ўлады новага прэзідэнта Джо Байдэна наўрад ці прынцыпова зменіцца. Для Трампа пытанне было разменнай манетай: мэтай быў не мір у рэгіёне, а дапамога стратэгічнаму саюзніку — Ізраілю. Улады Марока пагадзіліся на нармалізацыю адносін з яўрэйскай дзяржавай у абмен на прызнанне свайго суверэнітэту над запаветнай тэрыторыяй.

Еўрасаюз і ААН раскрытыкавалі дзеянні Вашынгтона і паабяцалі не змяняць прынятыя рашэнні па рэгіёне падобна ЗША. Аднак на пазіцыі амерыканцаў гэта ніяк не адбілася. У Белым доме нават паабяцалі заахвочваць сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Сахары і дзеля гэтага вырашылі адкрыць консульства ў горадзе Дахле (знаходзіцца ў частцы рэгіёна, якая кіруецца Марока), адзначыла lenta.ru.

У студзені 2021-га Дахлу наведаў пасол ЗША ў Рабаце Дэвід Фішэр і памочнік дзяржсакратара ЗША па справах Блізкага Усходу Дэвід Шэкнер. Іх візіт адзначыў пачатак работ па стварэнні мясцовага дыпламатычнага прадстаўніцтва. «Для мяне вялікі гонар наведаць гэты прыгожы і неверагодна важны для Марока рэгіён, каб распачаць працэс устанаўлення дыпламатычнай прысутнасці ЗША», — адзначыў Фішэр. Свой візіт ён палічыў «чарговай важнай вяхой» у 200-гадовай гісторыі дружбы паміж краінамі.

У каралеўстве адказалі ўзаемнасцю. Кіраўнік мараканскага МЗС Насер Бурыта заявіў, што Рабат нарэшце адчувае ў сабе сілы для барацьбы за рэгіён, — усё дзякуючы «дапамозе сяброў». «Мы цэнім такія жэсты. Консульства ў Дахле адкрые новую главу ў гісторыі, адкрые дзверы для міжнароднага гандлю», — расказаў журналістам кіраўнік рэгіянальнага савета горада Хатат Янджа. Ён з нецярплівасцю чакае прыбыцця чарговай дэлегацыі з ЗША, каб з яе дапамогай пераканаць

турыстаў у прывабнасці горада. Па словах кіраўніка савета, Дахла можа прапанаваць замежнікам пляжы, заход сонца неверагоднай прыгажосці і тавары высокай якасці.

Міжнародных інвестараў чакаюць сферы турызму, аднаўляльных крыніц энергіі і рыбалоўства. Зрэшты, хутчэй за ўсё прапанаваць інвестарам у Заходняй Сахары могуць менавіта рыбалоўства: порт Дахла жыццёва важны для мясцовай эканомікі, там працуе каля 70 працэнтаў рабочай сілы ўсяго горада. Тысячы лодак штогод прывозяць па паўмільёна тон рыбы, аб'ём гадавога экспарту складае 249 мільёнаў долараў.

ЦЯЖКІ ВЫБАР

Фактычна эканомікай рэгіёна займаецца Марока — цэнтр і кантралюе горад-порт Дахла. Пры гэтым магчымасці Рабата, які пабудаваў асноўную частку мясцовай інфраструктуры і заклікаў мараканцаў актыўна сяліцца ў горадзе, усё ж лімітаваныя. З-за рашэнняў ААН Марока абмежаваны ў магчымасці экспартаваць свае рэсурсы і адчувае цяжкасці пры заключэнні гандлёвых здзелак.

Плюсы рашэння ЗША аб прызнанні суверэнітэту Марока заканчваюцца на прывідных перспектывах узлёту эканомікі. Калі сітуацыя абвострыцца, рэгіён чакае зацяжная кровапралітная вайна — яе пагроза і так пастаянна навісала над мясцовымі жыхарамі.

Прадстаўнік POLISARIO ў ААН Сідзі Амар заклікаў амерыканскага прэзідэнта Байдэна ўсё ж такі адмяніць рашэнне Трампа. «ЗША не могуць адначасова падтрымліваць рашэнне ААН адносна канфлікту ў Заходняй Сахары і пры гэтым зацвярджаць суверэнітэт Марока над рэгіёнам», — лічыць ён.

Зрэшты, наўрад ці Байдэн зробіць выбар на карысць паўстанцаў. Між тым, як лічаць эксперты, рашэнне канфлікту паміж Марока і Заходняй Сахарай ляжыць на паверхні: трэба проста абвясціць рэферэндум, які

павінен быў адбыцца яшчэ ў 1991 годзе. Тады ААН нават стварыла адмысловую місію па правядзенні галасавання.

Сідзі Амар пагаджаецца з такой пазіцыяй і заклікае як мага хутчэй вырашыць праблему. Паводле яго слоў, ААН даўно ігнаруе магчымасць пачатку новага кровапраліцця ў рэгіёне. Амар адзначыў, што на самай справе ў Заходняй Сахары пануе хаос. Афрыканскія назіральнікі таксама асцерагаюцца, што ў рэгіёне можа распачацца маштабная вайна.

Небяспека кровапраліцця ўсё больш яўная: у канцы студзеня сілы POLISARIO нанеслі чатыры ракетныя ўдары па буфернай зоне Гергарат, якая знаходзіцца пад юрысдыкцыяй Марока. Арганізацыя абяцае, што гэта далёка не канец. Генеральны сакратар міністэрства бяспекі САДР Ульд Укал расказаў, што працягне ўзброеную барацьбу, хоць і разлічвае на міжнароднае супрацоўніцтва.

«Мы чакалі 30 гадоў — 30 гадоў пустых абяцанняў, увільванняў і невыноснага чакання», — заўважыў старшы супрацоўнік службы бяспекі POLISARIO Сідзі Ульд Лукал. Арганізацыя лічыць усю тэрыторыю Заходняй Сахары зонай баявых дзеянняў.

АДКУЛЬ ПАГРОЗА?

Пры гэтым высокапастаўленыя чыноўнікі ў Рабаце адмаўляюць небяспеку вайны. Па іх словах, ніякай шкоды зоне Гергарат нанесена не было, і наогул там быў усяго толькі пажар. «У асобных бакоў ёсць жаданне развязаць вайну, вайну прапаганды, вайну сродкаў масавай інфармацыі. Яны кажуць пра існаванне вайны ў Сахары, але на самай справе сітуацыя нармальная», — адзначыў адзін з мараканскіх чыноўнікаў, паведаміла lenta.ru.

Рашэнне Вашынгтона па Заходняй Сахары ўзрадавала мараканскіх яўрэяў: бо дружба Рабата і Тэль-Авіва выльецца ў адкрыццё прамых авіязносін. Па некаторых падліках, у каралеўстве яўрэяў каля трох тысяч — менш за працэнт насельніцтва. Пры гэтым сваёй прарадзімай рэгіён лічаць каля 700 тысяч чалавек.

Член мараканскай яўрэйскай абшчыны Фані Мергуі расказаў, што ўжо пакуе валізкі. «Я такі шчаслівы. Гэта сапраўдная рэвалюцыя», — захапляецца ён. Па словах мужчыны, дабрацца з Рабата да Тэль-Авіва можна будзе за пяць гадзін. Звычайна лётаць прыходзілася з перасадкамі — шлях мог расцягнуцца на цэлыя суткі. Пры гэтым нямала членаў яўрэйскай абшчыны жывуць на дзве краіны, частка ў Марока, іншая — у Ізраілі. Цяпер яны разлічваюць як мага хутчэй убачыць родных.

Нягледзячы на знешняе супрацьстаянне арабаў і ізраільцян, адносіны паміж Марока і Ізраілем у апошнія гады ўсё-такі не былі перарваныя цалкам. Не спыняўся і двухбаковы гандаль: па некаторых звестках, яго аб'ём з 2014 да 2017 года склаў 149 мільёнаў долараў.

Галоўная пагроза вайны ў рэгіёне на самай справе зыходзіць не ад мараканцаў, ЗША і нават не ад паўстанцаў. Абвастрэнне канфлікту ў Заходняй Сахары пагражае ўмяшаннем і канфліктам паміж іншымі зацікаўленымі краінамі. Напрыклад, POLISARIO і САДР дагэтуль падтрымлівае суседні Алжыр. У гэтай краіне больш як 180 тысяч сахраві — прадстаўнікоў народа, які пражывае на тэрыторыі Заходняй Сахары і выступае за аддзяленне ад Марока.

З іншага боку, падтрымаць мараканскі ўрад гатовыя ў Гамбіі. Па словах генеральнага консула краіны Усмана Баджа, апошняя ўдзячная за падтрымку: Рабат дапамагае ёй будаваць новыя адміністрацыйныя будынкі, дае гранты студэнтам. «Я думаю, рашэнне Штатаў толькі справакуе гвалт. Гэта прымусіць мясцовую моладзь злавацца, мабілізаваць сілы і настройвацца на вайну», — лічыць дырэктар міжнароднай крызіснай групы па Паўночнай Афрыцы Рыкарда Фабіяні.

Нягледзячы на гучныя заявы палітыкаў з усіх бакоў, насельніцтва Заходняй Сахары засяроджана на сваіх справах і праблемах. Жыхары Дахлы працягваюць хадзіць на работу, прадаваць апельсіны, наведваць крамы і вячэраць у кафэ. Іх жыццё цяпер напоўнена пагрозамі і чаканнем вайны, якая можа прыйсці як з Рабата, так і з Алжыра. Зрэшты, насуперак усяму яны працягваюць займацца звыклымі справамі. Прынамсі пакуль.

Захар БУРАК.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Минскагротранс», г. Минск, ул. Бабушкина, д. 29**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов: производственно-складская база, расположенная по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 12. Состав лота:

Административное здание с пристройкой, инв. № 640/С-25825, общ. пл. 1035,3 кв. м. **Здание культурно-бытовое**, инв. № 640/С-25834, общ. пл. 370,2 кв. м. **Здание ОГМ**, инв. № 640/С-25839, общ. пл. 416,1 кв. м. **Мойка**, инв. № 640/С-25827, общ. пл. 48,4 кв. м. **Кузница, склад**, инв. № 640/С-25823, общ. пл. 443 кв. м. **Ремонтная мастерская,** инв. № 640/С-25832, общ. пл. 1220,4 кв. м. **Ремонтная мастерская**, инв. № 640/С-25836, общ. пл. 1369,6 кв. м. **Узел управления**, инв. № 640/С-25841, общ. пл. 68,3 кв. м. **Пропускной пункт**, инв. № 640/С-110286, общ. пл. 82,8 кв. м. **Наружные тепловые сети,** инв. № 640/С-110284, общ. пл. 0 кв. м. **Элементы благоустройства**, инв. № 640/С-110291, общ. пл. 2119,1 кв. м. **Автозаправочная**, инв. № 640/С-25838, общ. пл. 62,3 кв. м. **Железобетонная эстакада с очистными сооружениями**, инв. № 640/С-110285, общ. пл. 84,8 кв. м. **Ливневая канализация**, инв. № 640/С-110288, общ. пл. 0 кв. м. **Металлическая эстакада для сварочных работ 2 ед.**, инв. № 640/С-110287, общ. пл. 132,2 кв. м

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 13.09.2066 для содержания и обслуживания зданий и сооружений автомобильного транспорта, общ. пл. 4,1160 га

Начальная цена (с НДС 20 %) – 994 558,88 бел. руб.
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета электронных торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Рэспубліка» 24.12.2020

Дата и время начала и окончания электронных торгов

Начало торгов: **11.00 02.03.2021**.
Окончание торгов: **13.00 02.03.2021.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 26.02.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Пиксель Электроникс»** (УНП 190822059) г. Минск, ул. Монтажников, д. 9-3, в лице антикризисного управляющего ООО «Антикризисное управление», тел. +375 (17) 348-37-29.

Четвертые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **22 февраля 2021 г. 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС
1	Грузовой вагон Mercedes-Benz Sprinter 511, рег. знак АН 4492-7, 2009 г. в.	20 160,00
2	Грузовой вагон Mercedes-Benz Vario 512, рег. знак АМ 8152-7, 2001 г. в.	17 040,00
3	Грузовой вагон Mercedes-Benz Sprinter 515, рег. знак АН 5705-7, 2009 г. в.	24 160,00
4	Грузовой вагон Mercedes-Benz Sprinter 515, рег. знак АМ 3640-7, 2008 г. в.	20 160,00
5	Грузовой вагон Mercedes-Benz Sprinter 515, рег. знак АМ 9286-7, 2008 г. в.	21 600,00
6	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3126-7, 2013 г. в.	49 200,00
7	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3130-7, 2013 г. в.	49 200,00
8	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3128-7, 2014 г. в.	47 120,00
9	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3132-7, 2014 г. в.	47 120,00
10	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3127-7, 2014 г. в.	45 040,00
11	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3131-7, 2014 г. в.	45 040,00
12	Грузовой фургон Mercedes-Benz Sprinter 515 AF-474525, рег. знак АО 3129-7, 2014 г. в.	49 200,00
13	Грузовой фургон Volkswagen Crafter Skat N10268, рег. знак АО 3104-7, 2014 г. в.	49 360,00
14	Грузовой фургон Volkswagen Crafter Skat N10268, рег. знак АО 3117-7, 2014 г. в.	44 480,00
15	Грузовой фургон Volkswagen Crafter Skat N10268, рег. знак АО 3118-7, 2014 г. в.	45 280,00
16	Грузовой фургон Volkswagen Crafter Skat N10268, рег. знак АО 3119-7, 2014 г. в.	49 360,00
17	Грузовой фургон Volkswagen Crafter Skat N10268, рег. знак АО 3102-7, 2014 г. в.	48 560,00
18	Грузовой фургон Volkswagen Crafter Skat N10268, рег. знак АО 3105-7, 2014 г. в.	49 360,00

Местонахождение – г. Минск, ул. Карвата, 88.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 08.02.2021 г. с 09.00 по 19.02.2021 г. до 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % – начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену за предмет торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи – 5 рабочих дней со дня проведения торгов, срок оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано на сайте bankrot.gov.by и в газете «Звязда» от 24.11.2020 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Молодечненский райагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

- здание ПТО с инв. № 630/С-75080 общ. пл. 134 кв. м;
- здание мастерской *(составные части и принадлежности: асфальто-бетонное благоустройство территории, забор, внутренние электрические сети)* **с инв. № 630/С-75050 общ. пл. 2211,7 кв. м;**
- арочник *(составные части и принадлежности: площадка для хранения техники)* **с инв. № 630/С-75049 общ. пл. 610,3 кв. м;**
- столярный цех с инв. № 630/С-76369 общ. пл. 167,8 кв. м;
- проходная с инв. № 630/С-76387 общ. пл. 25,2 кв. м;
- здание АЗС с инв. № 630/С-75048 общ. пл. 17,3 кв. м;
- здание автомойки *(составные части и принадлежности: эстакада)* **с инв. № 630/С-78789 общ. пл. 38 кв. м;**
- здание цеха по ремонту автомобилей с инв. № 630/С-78788 общ. пл. 906,2 кв. м;
- артскважина *(составные части и принадлежности: подземная камера, фильтр проволочный, электропогружной насос)* **с инв. № 630/С-78787, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 623884308601000686 площадью 2,7200 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Новая, 2Б;**
- гараж *(составные части и принадлежности: две смотровые ямы)* **с инв. № 630/С-76129 общ. пл. 198,3 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 623884308601000687 площадью 0,1600 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Новая, 2Б/7.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **863 616,00** бел. руб.
Начальная цена снижена на 20 %.
Задаток 10 % от начальной цены – **8 6361,60** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 26.11.2020.

Аукцион состоится **25.02.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.02.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Телефоны для осмотра: 8 (0176) 58 13 24; 8 (025) 524 88 64; 8 (029) 778 03 13.

УНН 600077381

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 10 марта 2021 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже объекта недвижимости – здания склада КРС с инв. № 311/С-31686, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гомельхлебопродукт» на праве собственности

Состав лота № 1:
здание склада КРС, инв. № 311/С-31686. Адрес: Гомельская обл., Добрушский р-н, Утевский с/с, п. Степь. Назначение: здание специализированное складов. Одноэтажное кирпичное строение. Общая площадь 935,0 кв. м.Составные части и принадлежности: три гаража, склад

Начальная цена лота: 43 920,00 рубля (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
